Д-р Я. Станкевіч.

Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом.

ВІЛЬНЯ — — — — — — — — 1933.

Д-р Ян Станкевіч.

Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом.

ВІЛЬНЯ — — — — — — — — — 1933.

Адбітка з Гадавіка Беларускага Навуковага Таварыства, кн. I.

Друкарня Я. Левіна Вільня, Нямецкая 22.

Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом[1].

I. Начырк гісторыі беларускіх мусульманаў.

Мусульманмі ў Беларусі спачатна былі так-званыя Татары. Зьяўляліся яны ў Беларусі або як палоньнікі, узядзеныя на вайне, або як палітычныя ўцекачы, а напару былі й самахвотныя колёністыя з татарскіх аддзелаў, памагаючых Беларусам у вайне іх з суседзьмі. Першыя весьці аб Татарах у Беларусі ё ўжо з пачатку чатырнанцатага стагодзьдзя. У 1319 годзе яны прыймалі ўчасьце ў вайне Беларусаў і Ліцьвіноў із Крыжакамі[2]). Летапісец францішканскага ордэну пад 1324 г. сьведчыць, што пасярод Вялікага Княства Літоўскага жывуць людзі, каторыя прыйшлі з Азіі і ў сваіх малітвах ужываюць нейкую няведамую мову азыяцкую[3]).

Гаспадары Вялікага Княства Беларускага (званага Вял. Княствам Літоўскім) карысталі з непарадкаў у Залатой Ардзе, што насталі тамака ад палавіцы чатырнанцатага стагодзьдзя, мяшаліся ў войны татарскіх ханаў за пасад, памагаючы сваім прыяцелям. Па гэткіх войнах выдатнейшыя прыхільнікі пераможаных ханаў звычайна знаходзілі прыпынак у вялікіх князёў беларускіх („літоўскіх"). Асабліва гэткаю палітыкаю адзначыўся пры канцы XIV і на пачатку XV стагодзьдзя наймагутнейшы валадар на Усходзе Эўропы вялікі князь Вітаўт (1386—1430). Геній Вітаўтаў ня меў сабе раўні. Ніхто да яго і ніхто па ім не зразумеў так шырака і так добра заданьняў беларускае палітыкі, як Вітаўт; ён рупіўся прылучыці да ўсяго беларускага Народу часьць беларускага плямя Вяцічаў, што лучылі пад Маскву. Дзеля гэтага Вітаўт пры помачы свайго кандыдата на пасад Залатое Арды імкнуўся заваладаці гэтым гаспадарствам, а пераз яго і належачай да яго Масквой. Каб выпаўніці свае пляны, ён

---

[1]) На жаданьне Аўтара ў гэтай стацьці пакінены некаторыя асаблівасьці ягонага правапісу (поўнае „аканьне" ў чужаземных словах—„літаратура", „характарны", ужываньне формы „прэдкі" замест продкі, „адзінанцаць" замест адзінаццаць), этымолёгічных форм („узядзены" замест узяты, „зналы", „эміграваны"), слоўніку („просьле" замест пасьля, „даймо" замест уражэньне, „падзеля" замест дзеля, „пярэднія" замест папярэднія) і стылю (стаўляньне азначэньня пасьля азначанага слова) і інш. — *Рэд.*

[2]) А. Мухлинскій: Изслѣдованіе о происхожденіи и состояніи литовскихъ татаръ. С. Петербургъ. 1857, бал. 6.

[3]) Lucae Wadingi Annales ordinis Minorum ab anno 1208 ad an. 1540 Lugdeni 1672, том I-ы, бал. 459.

у 1396 г. зрабіў паход за Дон проці Татароў. Палоньнікі, узядзеныя пры гэтым паходзе, былі аселены ў Беларусі. Паражка Вітаўта ў бітве на рацэ Ворскле 1399 г. не адхінула яго ад татарскае палітыкі. Мы ведаем, што перад 1410 г. зносіны Вялікага Княства із Залатой Ардой былі вельмі жывыя. У гэтым годзе валадар Залатое Арды Цімур хан (1410—1415) прыслаў Вітаўту, як памогу проці Крыжакоў, колькі тысячаў [1]) коньнікаў пад камандай Джэляль-эд-дына, сына Тухтамышовага.

Па скончаньні вайны з Крыжакамі часьць татарскіх вояў асталася ў Беларусі. Яны дасталі зямлю ад ураду за павіннасьцьісьці на вайну.

Борзда Вітаўт адудзячыў Джэляль-эд-дыну. За колькі год Джэляль-эд-дын прыехаў у Кіеў прасіці помачы ў вялікага князя, каб заняці пасад у Залатой Ардзе. Помач была дадзена і, скарыстаўшы з непарадкаў у Кіпчаку, Джэляль-эд-дын у 1415 г. скінуў із пасаду Цімур хана, а сам стаўся ханам Залатое Арды

Наагул значэньне беларускага гаспадарства ў тыя часы і ягоных гаспадароў, асабліва Вітаўта, было вялізарнае. Заходне-эўропэйскі падарожнік таго часу, Ляную, каторы праяжджаў пераз украінскія сьцяпы, расказуе, што Татары так напалоханыя Вітаўтам, што маткі страшаць ім сваіх дзяцей. Татары, качуючыя на заход ад Дняпра і на'т Днястра, прызнавалі беларускага гаспадара сваім валадаром. А Татары на ўсход ад Дняпра, блізка Кіпчаку, таксама залежылі ад Вялікага Княства Літоўскага (=Беларускага). На беразе Чорнага мора была беларуская гавань Хаджы-бэй, цяперашняя Адзеса. Ля Дняпра Беларусь мела замкі—Крамянчуг, Упск, Місурын, Гербедзеяў Рог, Тавань, Баргунь, Цягінь (Бэндзеры) і Ачакаў, у каторых дзяржала войска дзеля абароны ад татарскіх вордаў самастойных, качуючых за Донам [3]).

Вялікі князь Вітаўт асяліў Татароў паміж беларускага насяленьня ў ваколіцах рэкаў Вяльлі й Нёмна, у паветах Троцкім, Віленскім, Ашмянскім, Лідзкім, Наваградзкім ды ў заходняй часьці Гарадзеншчыны (паветы Бельскі, Берасьцейскі, Сакольскі і інш). Вышшай клясе перасяленцаў былі дадзены шляхоцкія прывілеі і вялікая зямельная собкасьць. Апрача таго вялікія князі, асабліва Вітаўт, давалі гэтай клясе розныя дары.

Палітыка Вітаўтава, каб аслабіці й узалежніці ад Беларусі Залатую Арду, мела ўдачу асабліва ў вадарваньню ад яе Крыму. Першы крымскі хан Азі-Гірэй (начай: Хаджы-Гірэй) да занятку пасаду жыў у Беларусі каля Трокаў. Адгэнуль Вітаўт паслаў яго на крымскае ханства. [4]) Азі-Гірэй быў закладчыкам крымскае дынастыі Гірэяў. Па Яго сьмерці ў 1466 г. паміж ягонымі сынамі ўзьнялася вайна за пасад. У гэтай вайне Казімер Ягайлавіч памагаў свайму прыхільніку Нуры-дэўлету. Як брат гэтага, Мэнглі-Гірэй, заняў пасад, прыхільнікі Нуры-дэўлетавы мусілі ўцякаць да свайго апякуна ў Беларусь [1]).

---

[1]) Прыраўнуй у А. Мухлінскага: Zdanie sprawy... бал. 12 і 38

[2]) Ibid., бал. 39.

[3]) Аб гэтым сьведчыць Халькондыляс Ляонікус у другой кнізе гісторыі Турэччыны.

[4]) Michalonis Litvani: De moribus tartarorum, litvanorum et moscorum fragmenta decem (Архивъ истор.-юридич. свѣденій, относящихся къ Россіи, изд. Н. Калачовымъ. Москва. 1854).

Як у 1510 г. Татары былі пабітыя ля Клецка князем Міхалом Глінскім, дык забраныя палоньнікі таксама былі аселены ў Беларусі, паміж іншым у Менску.

Ня маем жадных весьцяў, ці былі яшчэ якія колёністыя татарскія ў пазьнейшую пару. Відаць, што іх запраўды ня было, бо з пазьнейшае пары напэўна захаваліся-б якія весьці.

Адначасна з пасяленьнем у Беларусі Татары дасталі ваенную арганізацыю. Першым маршалкам іхнім быў Тэмір Туган-бэй, князь із Дагестану. Усё войска мусульманскае дзялілася на сьцягі (пазьней харугвы). Камандзер сьцягу ўвайну вёў свой сьцяг да адпаведнага вайводы, а напару проста да польнага гэтмана. Галоўная каманда гэтага войска была ў Вільні ля цяперашняе Татарскае вул. Хто йшоў на вайну, той не плаціў жадных падаткаў.

Апрача мусульманаў-вояў былі ў Беларусі яшчэ мусульмане мескія, занятыя промыслам і гародніцтвам. Гэтыя плацілі падаткі.

Пры вайводзкіх урадах былі яшчэ так званыя татары-казакі, пасыланыя з лістамі.

Паміж сабою ў рэлігійных і грамадзкіх справах мусульмане судзіліся Коранам. У зносінах із іншым беларускім насяленьнем паддадзены былі праву агульна-прызнаванаму, г. зн. Літоўскаму Статуту. Ужываньне Корану, як юрыдычнае кнігі, было пацьверджана ім Вялікімі Князьмі. [2]).

Наагул ажно да сходу беларускага гаспадарства й залежнасьці ад чужнікоў мусульмане ў Беларусі мелі поўную рэлігійную свабоду. Падарожнічалі яны так сама ў сьвятыя месты ісламу — Мэкку й Мэдыну. Дзеля таго што ня зналі мясцовае мовы, у Царгорадзе стараліся прылучыцца да тых падарожнікаў, што зналі турэцкую або арабскую мову. Адзін із такіх беларускіх падарожнікаў, чалавек асьвячоны, у 1557 г. на просьбу вялікага візыра Рустэма пашы напісаў султану Сулейману рэфэрат аб палажэньні беларускіх мусульманаў. У рэфэраце закранае траха ўсе бакі жыцьця нашых мусульманаў. Кажа, што ў кожным большым месьце ёсьць мэчыці. Да гэтакіх местаў належыць сталіца гаспадарства Вільня, Сорак Татары, Вака, Навагарадак, Трокі і інш. — У гэтых мястох вялікія мэчыці, а ўсіх, у тэй лічбе такжа малых, што ў прыватных дамох, можа быці балей за сто". Падарожнік зацеміў, што ў Вільні мэчыць стаіць на найхарошшым месцу. Гэтая зацемка, а таксама тое, што аўтар

---

[1]) Што гэтак было запраўды, відаць вось із гэтага. Гісторык Крыму Сэід Мугамэд Рыза кажа, што просьле гэтае вайны праціўнікі Мэнглі-Гірэевы ўцякалі ў кірунку Волгі й да суседніх краёў. А. Мухлінскі, Zdanie sprawy, бал. 32.

З другога боку, падарожнік з беларускіх мусульманаў, што напісаў у 1557 г. султану Сулейману рэфэрат аб беларускіх мусульманах, кажа даслоўна гэтак: „Бацька мой знаў яшчэ старога, каторы прыехаў разам із іншымі, і казаў, што сем'і нашага роду, зморaныя несупакойным жыцьцём, пакінулі свае сялібы і перасяліліся ў гэныя краі".

Менаваны рэфэрат перакладзены А. Мухлінскім на польскую мову і разам із шмат якімі выясьненьнямі надрукаваны ў выдавецтве „Teka Wileńska", Вільня. 1858, т. 4-6. З яго тут шмат карыстаю.

[2]) А. Мухлінскі, Zdanie sprawy... 77.

рэфэрату ня ведае аб пасяленьні ў Менску татарскіх палонных з 1510 г., сьведчыць аб яго паходжаньні з Віленшчыны. Аўтар рэфэрату перакананы, што „Калі-б вялікі падышах (султан) паслаў у гэныя краі ад парогу свае шчасьлівасьці (Стамбулу) рупатлівых місыянэраў, бяссумлеву большасьць іхняга насяленьня была-б абдорана сьвятлом ісламу". Каб на гэта схінуць султана, падарожнік дадае, што султан і вялікі візыр мелі-б харошых одалісак. У Царградзе падарожнік бачыў сваіх родзічаў-мусульманаў, каторыя розьніліся ад Туркаў вопраткаю. Хоць ім было добра ў турэцкіх аднавернікаў, але яны тужылі па бацькаўшчыне.

Дабро, зробленае беларускім урадам мусульманам, зблізіла іх з беларускім гаспадарствам і народам. У мэморыяле, пададзеным 1519 г. Вялікаму Князю Жыгімонту ІІ, мусульмане кажуць: „На шаблі нашыя мы прысягалі, што любім Ліцьвіноў (разумей: Беларусаў, бо гэткі быў тады беларускі нацыянальны назоў), каторыя ўвайну забралі нас у палон, але ўступаючым на гэтую зямлю сказалі, што гэты пясок, гэтая вада і гэтыя дзеравы нам супольныя. І ля салоных азёраў (г. зн. ў Крыме) і ў Кіпчаку ведаюць, што ў нашым краю мы не чужнікі".

Па сьмерці кожнага Вялікага Князя мусульмане мелі па ім службы ў мэчыцях. Асаблівую пашану меў у іх Вітаўт Вялікі. Службу па ім служылі яшчэ ў XVI ст. Памяць аб ім была ў гэтым стагодзьдзі жывая ўва ўсіх мусульманаў. У тым-жа мэморыяле кажацца: „Няма слаўнае памяці Вітаўта, ён нам не казаў забыціся прарока, а мы, да сьвятых местаў вочы нашыя зварочуючы, так імя ягонае ўспаміналі, як нашых каліфаў. Нашыя дзеці ведаюць аб ім". Аўтар рэфэрату султану Сулейману кажа, што Вітаўт быў стаўпом, удзержуючым іслам у краю няверных, і што „памяць аб ім захавалася да нашае пары, бо кожны год сьвяткуецца дзень, вылучна пасьвячоны памяці гэтага гаспадара. Мусульмане, жывучыя ў гэным гаспадарстве, такога дня зьбіраюцца ў мэчыцях і ўспамінаюць ягонае імя з захапленьнем".

Беларускія мусульмане ваявалі ня толькі проці Маскоўшчыны і інш., але таксама проці сваіх аднавернікаў—крымскіх Татароў і Туркаў. Аб гэтым ёсьць шмат дакумэнтаў. У 1510 г. татарскія ворды пусташылі паўднёвыя землі беларускія, пакуль ня былі пабітыя кн. М. Глінскім. Яны клікалі сваіх аднавернікаў, каб злучыліся з імі. Нашыя адказалі: „Ані Бог, ані прарок ня кажа вам грабіці, а нам быці няўдзячнымі; б'ючы вас, мы б'ем грабежцаў, але ня нашых братоў".

У Літоўскай мэтрыцы ёсьць лісты Вял. Кн. Жыгімонта ІІ з 1533 г. да маршалкі і ўсіх камандзераў татарскіх сьцягоў на вайну проці Татароў.

Жыгімонт IV, даючы ў 1623 г. К. Мурзе Барынскаму грамату на сьцяг, дадае да яе, што К. Мурза Барынскі быў „час немалы ў розных экспэдыцыях так маскоўскай з Інфлянцкай, яка і нядаўна прошлай Валоскай служачы і ў частых патрэбах з войскі непрыяцеля Крыжа сьвятога"[1]).

[1]) А. Мухлінскі, Zdanie sprawy...

Спачатныя татарскія колёністыя належылі да розных плямёнаў і расаў, каторыя вельмі розьніліся паміж сабою, асабліва антрополёгічне. Былі „татары", каторыя належылі да расы турка-татарскае, фінскае, а часткава так жа мангольскае. Апроч таго паміж Татарамі на паўночным Каўказе, а на'т у Крыме, былі народы арыйскага паходжаньня. Уся менаваная мешанка была ведамая пад агульным іменем Татароў. Расавая й пляменная розьніца, аднолькава як і раскіданасьць на вялікіх прасторах паміж беларускім насяленьнем, не дала магчымасьці ім утварыць якуюсь этнографічную цэласьць, хоць гэтаму прыялі рэлігійныя ўмовы. Як ваенныя палоньнікі або наагул ваякі ці ўцекачы, ня мелі яны із сабою жанок свайго паходжаньня. Вялікі Князь Вітаўт дазволіў ім ажаніцца з Беларускамі. Як першыя, так і пазьнейшыя татарскія колёністыя жаніліся з Беларускамі—хрысьцянкамі. Жанкі аставаліся пры сваёй веры хрысьцянскай і па сьмерці былі хаваны асобна ад мужоў на могільніках хрысьцянскіх. Але дзеці з гэтакіх жанімстваў былі гадаваны ў веры айцоў. Гэта было ў згодзе із загадамі ісламу, каторы дазваляе жаніцца з хрысьцянкамі й жыдоўкамі, але забараняе выходзіць замуж за хрысьцянаў і жыдоў; пры гэтым дзеці заўсёды мусяць быць магамэданамі.

Гэтакія жанімствы з хрысьцянкамі былі ў Беларусі звычаем ажно да XVII в. З XVI в. маем аб гэтым сьведчаньне ад вышменаванага аўтара рэфэрату. Гэтак ён кажа: „а дзеля таго што цяжка знайсьці тамака жанок нашае веры, жэняцца з няверніцамі (хрысьцянкамі), тым балей, што наш закон гэтага не забараняе".

Дазвол жаніцца з хрысьцянкамі быў дадзены з умоваю, што будуць меці толькі па аднэй жонцы. Гэта пад уплывам суседзяў-хрысьцян увайшло потым у звычай, так што й багатыя ня мелі ніколі балей, як па аднэй жане.

У багатых сем'ях мусульманскіх краёў жанкі дзяньгубяць, але жанкі беларускіх мусульманаў, як бедных так і багатых, нічым ня розьніліся ў сваім жыцьці ад іншых Беларусак: працавалі ў гародах, на полі, пралі кудзелю і пад.

Ад жанок сваіх шмат хто з беларускіх мусульманаў дастаў сваё прозьвішча, напр. Родкевіч, Багдановіч, Юркевіч і пад. Іншыя ўтварылі прозьвішчы ад імёнаў сваіх айцоў, дадаючы да іх, паводле беларускага способу, суфіксы—*іч*,—*ов-іч*,—*ев-іч*: Ахматовіч, Дзяфіровіч (ад Джафіра), Юсуповіч (ад Юсуф) і інш. Некаторыя дасталі прозьвішчы ад сваіх двароў: Крычынскі, Карыцкі.

Жаньбамі з Беларускамі спачатныя татарскія колёністыя зьмянілі свой антрополёгічны тып ды прынялі мову й культуру беларускую. Характарызуючы беларускіх мусульманаў, А. Мухлінскі кажа, што яны „ані непадобныя да мангольскіх плямёнаў" [1]). Гэтая падвойная—этнічная й этнографічная—асыміляцыя беларускіх мусульманаў дае нам права зваць іх Беларусамі. Вельмі борзда нашыя мусульмане забыліся сваю ранейшую мову, бо бяссумлеву жанкі-

[1]) Изслѣдов. о происх. и сост. лит. татаръ. СПБ. 1857. бал. 48.

Беларускі ня вучыліся „пататарску“. Дзеля таго ўжо наступное пакаленьне гаманіла вылучна пабеларуску. Аўтар рэфэрату ў Царградзе 1557 г. кажа: „Цяпер малая колькасьць мусульманаў гамоне тамака паатамански, пры тым адно таковыя, што ў бліжшай да нас пары перасяліліся ў той край“. Умеючымі пататарску, мусіць, былі татарскія палоньнікі з 1510 г.

Аднак мусульмане ў Беларусі заўсёды былі званы Татарамі. Аўтар рэфэрату кажа: „Называюць нас у гэных краёх агульным іменем Татароў, хоць найвялікшая колькасьць нас, здаецца, паходзе не ад тых дзікуноў, што былі заўсёды ў мусульманаў у найвялікшым грэбаваньні, але барждж эй ад дабрароднага й ваяўнічага роду Сяльджукоў, продкаў Атаманаў. Не качуем также ў буданох ані не бадзяемся па сьцяпох, але што зробіш, у гэных краёх, калі хто мае веру іншую, як няверн ікі, ужо дзеля таго завуць яго Татарынам“.

З часам беларускія мусульмане замест ранейшых кнігаў арабскіх і, хіба, часткава, татарскіх дзеля сваіх рэлігійных патрэбаў пачалі перакладаць і пісаць свае кнігі пабеларуску. Гэта была пара XVI й XVII в.в., калі беларускі язык быў царкоўнай (літургічнай) моваю ісламу ў Беларусі. Адылі ня вылучана, што ўжо ў XV в. беларускія мусульмане мелі кнігі, пісаныя пабеларуску. Не пазьней як у XVII стаг. на беларускі язык быў перакладзены Коран[1]). Ужываючы беларускі язык у сваіх літургічных і наагул рэлігійных кнігах, мусульмане пісалі іх агульна прынятай у мусульманскім сьвеце арабскай абэцэдаю.

Рэзультаты ўпадку беларускае культуры адбіліся також на культурным жыцьці Беларусаў-мусульманаў. У канцы XVI в. пачынаецца полёнізацыя беларускае шляхты. З ёй разам полёнізуецца й яе мусульманская галіна. Уплыў польскае мовы ў беларускіх мусульманаў праяўляецца ўжо ў XVII стаг., калі побач з рэлігійнымі кнігамі беларускімі зьяўляюцца кнігі, пісаныя папольску (так сама арабіцаю)[2]). У XVIII і XIX стаг. ў беларускіх мусульманаў існуюць побач кнігі беларускія й польскія. У XVIII стаг. беларуская мова пад націскам мовы польскае перастала быць царкоўнаю (літургічнаю) моваю ісламу ў Беларусі. Але й польская мова, хоць і выціснула мову беларускую, сама не магла прыняцца ў мэчыцях у Беларусі, бо просты вескі й мескі люд мусульманскі папольску не разумеў. У XVII і XVIII стаг. на‘т ня было перакладу Корану на польскую мову, каторы пераклаў ажно ў 1857 г. Ян Тарах Бучацкі. Проці А. Мухлінскага і Ю. Талька-Грынцэвіча цьверджу, што ніколі польскі язык ня быў моваю мусульманскае царквы ў Беларусі. Гэтыя два дасьледавальнікі гісторыі беларускіх мусульманаў на‘т не прабуюць менаванага свайго пагляду давесьці, прыймаюць apriori, бо былі пісаныя

[1]) Гл. ніжэй на бал. 122 аб пары паўстаньня беларуска-мусульманскіх рукапісаў, што ў бібліётэцы Пецярбурскага ўнівэрсытэту.

[2]) А. Мухлінскі ў „Изсл. о происх. и сост. Лит. Татаръ. СПБ. 1857. прыводзе прыклады з польскіх рукапісаў арабіцаю не ранейшых як з XVII стаг. Паводле тагачасных культурных адносінаў у Беларусі нельга спадзявацца ў беларускіх мусульманаў польскіх рукапісаў з ранейшае пары.

некаторыя малітвеныя кніжкі папольску. Але быцьцё польскіх малітвеных кніжкаў яшчэ не даводзе, што польская мова ўжывалася ў мэчыцях публічна або ўсім людам мусульманскім. У стаг. XIX і XX ё рэлігійных кніжкаў мусульманскіх, папольску пісаных і друкаваных (лацініцаю), шмат балей, чымся ў стагодзьдзях папярэдніх, аднак ніхто на‘т не прабаваў увесьці польскую мову ў публічна-рэлігійнае жыцьцё мусульманскае—у мэчыць. Калі-б жа польская мова ўжывалася ў мэчыцях пад канец XVII або ў XVIII в., дык што яе адтуль выціснула-б? Гэта-ж ведама, што ўплыў польшчыны ў Беларусі ад XVII ст. ўмацоўваўся. Падзел Польшчы толькі яго павялічыў, а дайшоў ён найбольшае сілы ў стаг. XIX. Польская мова ў рэлігійным жыцьці беларускіх мусульманаў была справаю чыста шляхоцкай. Пэўна тое, што па ўпадку беларускае культуры мусульманскія малітвеныя кнігі, пісаныя, а пазьней і друкаваныя, папольску, служылі дзеля прыватнага ўжытку сполёнізаваных беларускіх паноў мусульманскае веры.

Аддаліўшы із свае царквы беларускі язык, мусульмане вярнуліся на колькі стагодзьдзяў назад да незразумелага арабскага языка. Не разумеюць яго на‘т імамы (муллы, малны). Гэтае заданьне разумець пакідаюць яны Богу, каторы, як кажацца ў кнігах нашых мусульманаў, „усіх языкоў зналы“.

Апрача дарагіх памяткаў калісь пануючае беларускае культуры, захаваных у нядаўна знойдзеных кнігах, захаваліся яшчэ ў мусульманаў дробныя знакі гэтае культуры ў беларускіх надпісах з выбітым паўмесяцам і сэнтэнцыямі з Корану на магільных камянёх па ўмерлых сяброх мусульманскае арыстократыі, прыкл. на могільніку ля мэчыці ў Даўбуцішках (Ашмянскі пав.). Пазьней замест надпісаў беларускіх ужываліся падобныя надпісы папольску. Просты народ на магільных камянёх надпісаў не рабіў.

Шмат важней, што беларуская культура адбілася ў душах беларускіх мусульманаў, чаго довадам ё, прыкл., тое, што пахоўныя песьні іхнія, розьнячыся ад падобных песьняў Татароў казанскіх і крымскіх, сваёй мэлёдыяй вельмі блізкія да беларускіх народных песьняў [1]).

Беларускія мусульмане карысталіся свабодаю рэлігійнай і поўнымі грамадзкімі правалі, мелі яны также гаспадарскі дабрабыт.

Калі настаў сход беларускае культурнае й палітычнае магутнасьці ды прыйшоў чужы ўплыў і залежнасьць, палажэньне нашых мусульманаў памалу горшала. Асабліва былі абмежаныя правы мусульманаў за рэакцыйнае дзяржавы Жыгімонта IV (1587 — 1632). У гэтую пару настала запраўднае перасьледаваньне беларускіх мусульманаў. У „Літоўскі Статут“ 1588 г. ўнесьлі „Каб жадны мусульманін ня быў ураднікам“. У 1615 г. забаронена ў мусульманскіх харугвах мецi сваіх ротмістраў і харужых, каторыя мусілі быць абіраныя із шляхты іншае веры. Нягледзячы на тое, што галоўным за-

[1]) Ю. Талька-Грынцэвіч, Muślimowie, 75.

няткам большасьці мусульманаў была вайна, мусульманін мог дaслужыцца толькі да паручніка ўлучна. У 1616 г. сойм забараняе магамэданам жаніцца з хрысьцянкамі пад страхам сьмерці абедзьвім старанам. Даглядаць выпаўненьня гэтага права даручана інквізыцыі [1]). Забаронена так сама ставіць новыя мэчыці і папраўляць старыя.

Пры гэтых ліхіх адносінах насяленьне мусульманскае меншала. У 1557 г. аўтар няведамага прозьвішча вышменаванага рэфэрату султану Сулейману падаваў колькасьць мусульманаў у цэлым Вялікім Княстве (г. зн. і з украінскімі землямі) на 200.000. Лічбу гэтую можна ўважаць за шмат большую, чымся была запраўды. Аўтар ня меў статыстычных дадзеных, яму адно здавалася, што толькі будзе. Аднак, хіба, колькасьць была ладная. Тым часам каля 1618 г. было 10.000 мусульманаў у Беларусі, здольных на вайну. У 1631 г., паводле рэвізіі Кердзеевае, было ўсіх мусульманаў у Вял. Княстве 20—25 тысячаў мускога полу. У 1654 г. было на службе ўсяе Рэчыпаспалітае адно 1383 мусульманскіх коньнікаў.

Вялікае няшчасьце стрэла мусульманаў у часе вайны із Швэдзіяй 1656—1660 г. Расказуе аб гэтым Уладзіслаў Сыракомля на аснове знойдзеных ім дакумэнтаў мусульманскіх. У 1656 г., калі Швэды занялі Беларусь, шмат якія мусульмане із сваімі сем'ямі ўцяклі ў Польшчу. Калі далей Швэды занялі Польшчу, мусульмане варочаліся назад у Беларусь. У 1656 г. у чэцьвер перад Вялікаднем, калі яны ехалі із Замброва табарам з 300 вазоў із жанкамі, дзяцьмі й маемасьцяй, прагавітая польская шляхта кінулася іх рабаваць. Не памаглі на'т каралеўскія ўнівэрсалы: узброеных мусульманаў пабілі, безбаронныя ўцяклі, табар зрабавалі, а жанок зьняважылі. Падобныя напады паўтараліся й на іншыя табары мусульманскія, прыкл. на табар, што йшоў пераз Ломжу ў кірунку на Гонёндз [2]).

Непапраўнай шкодаю было, што польская шляхта, рабуючы мусульманскую маемасьць ля Бронска й Гонёндза, зьністожыла рэлігійныя кнігі іхнія [3]).

Рэзультатам падобных нападаў было тое, што сёлы мусульманскія асталіся без насяленьня.

У рэзультаце перасьледаваньня мусульманскае насяленьне змушана было высяляцца ў Крым і Турэччыну. З эміграваўлых за Жыгімонта IV і пазьней утварыліся тры колёніі, каторыя дагэтуль розьняцца ад Туркаў тыпам і адзежаю. Адна із гэтых колёніяў ё ў Дабруджы на беразе Дуная, другая ў ваколіцах Брусы ў правінцыі Хелевенгар, трэйцяя ў Малой Азіі ля вусьця ракі Кызыль-Ірмак. У палавіне мінулага стагодзьдзя колькасьць насяленьня гэтых трох колёніяў перавышшала 36.000 чал. [4]).

У 1672 г. ў часе вайны з Турэччынаю часьць беларускіх мусульманаў перайшла на бок Туркаў. Гэтыя іх пасялілі ля Каменца Падольскага. Пад іменем Ліпкаў яны нападалі на належачыя да

[1]) Vol. Leg., бал. 309-310.
[2]) Сыракомля Ул., Wycieczki po Litwie. Том II, бал. 22-23.
[3]) Ibid., бал. 23 й 25.
[4]) А. Мухлінскі, Zdanie sprawy..., бал. 47.

Польшчы ўкраінскія землі. Дзеля таго што, апрача супольнае веры, іх з Туркамі нічога ня лучыла, пайшлі яны на намовы Сабескага і ў 1683 г. згадзіліся ваяваць проці Туркаў і Татароў.

Таксама ў ліхіх варунках былі беларускія мусульмане ў XVIII стаг. У другой палавіне гэтага стагодзьдзя ў Польшчы памалу пачынаюць разумець, што перасьледаваньне не вядзе да дабра. Дзеля таго йдуць такжа на ўступкі і ў адносінах да мусульманаў. У 1768 г. дазволена беларускім мусульманам папраўляць і ставіць новыя мэчыці. Зроблены былі некаторыя палёгкі ў войску. Але даўнейшае права, забараняючае мусульманам займаць вышшыя ўрады, асталося ажно да падзелу Рэчыпаспалітае.

Па падзелу Польшчы Беларусь лучыла пад Расею. Расейскі ўрад у сваіх русыфікацыйных імкненьнях стараўся выкарыстаць рэлігійную розьніцу паміж Беларусамі. Стараючыся ў сваёй русыфікацыйнай палітыцы ў Беларусі знайсьці саюзьніка ў беларускіх мусульманах, Расейцы зраўнялі іх у правох з хрысьцянскім насяленьнем і далі прыступ да ўсіх урадаў і дастаенстваў. У 1831 г. расейскі ўрад загадаў прызнаваць усіх беларускіх мусульманаў шляхтаю дваранмі). Значыцца, вера сталася довадам шляхоцтва. Мусульмане з гэтага карысталі, часта бывалі высокімі ўраднікамі, але ў русыфікацыі Беларусі, апрача колькі адзінкаў, ураду не памагалі.

Паводле расейскага сьпісаньня насяленьня 1897 г. мусульманаў у гэтым годзе ў Беларусі было: у Менскай губ. 5364, у Віленскай 3789, Горадзенскай 2084. У населенай толькі часткава Беларусамі Ковенскай губ. запісана мусульманаў 1443.

Гэтай лічбаю абняты такжа расейскія жаўнеры мусульмане з казанскіх Татароў і інш. Проф. Сьц. Базарэўскі, сам мусульманін, уважае, што без чужнікоў у менаваных губэрнях было ў 1897 г. 10680 мусульманаў [1]).

Паводле тае-ж расейскае статыстыкі з 1897 г. ў Коўні былі 1004 мужчыны мусульманскае веры і адно 70 жанок. Коўня была крэпасьцяй. Дык трэба лічыць, што ў Коўні каля 900 мужчынаў мусульманскае веры былі чужнікі. Калі далей зьвернем увагу, што ў пав. Браслаўскім, г. зн. ў беларускай часьці Ковенскай губ., было звыш 200 мусульманаў (у вадных Відзах, дзе не стаяла войска, было 150), абачым, што лічба мусульманаў у Літве не перавышае 300. Значыцца, на этнографічнай Беларусі ў 1897 г. мусульманаў было каля 10.400 чал.

Із статыстыкі бачым, што цяперашняе расьсяленьне беларускіх мусульманаў адпавядае іх расьсяленьню ў XV—XVII стаг. З местаў найбалей мусульманаў жыло ў Менску (1323) і ў Вільні (482). У паветах найбалей у Троцкім (1243), Наваградзкім (942), Менскім (818) і Ашмянскім (788).

[1]) Талька-Грынцэвіч, Muślimowie, бал. 68.
Сьц. Базарэўскі розьніцу ў 2.000 людзей у колькасьці мужчын і жанок у веку 20-29 г. адыймае ад усяе колькасьці і гэтак дастае лічбу 10.680.

У часе вайны насталі некаторыя зьмены ў колькасьці мусульманаў у васобных мясцовасьцях. Паводле статыстыкі мусульманскае арганізацыі ў Вільні („Культурны Зьвяз“) на землях, абнятых цяперашнім Польскім Гаспадарствам, у 1931 г. было каля 6.000 [1]) мусульманаў; з гэтае лічбы колькі дзесяткоў жыве ў Варшаве, а ўсе іншыя ў Заходняй Беларусі.

Простыя мусульмане, як сяляне так і мяшчане, гамоняць пабеларуску, паны з народам пабеларуску, а з панамі і міжсобку папольску, часткава парасейску.

Як калісь, так і цяперака просты беларускі народ заве мусульманаў Татарамі, разумеючы пад гэтым назовам іх належнасьць да ісламу. І, так сама як калісь, мусульмане беларускія ўважаюць гэты назоў за зьнявагу, заяўляючы, што яны мусульмане, але не Татары.

Беларускія мусульмане апрычоных звычаяў, абрадаў, убораў і пад. ня маюць і ўва ўсім, апрача веры, ня розьняцца ад іншых Беларусаў. Апрача ўсяго іншага, нашыя мусульмане розьняцца ад сваіх аднавернікаў — Татароў казанскіх і крымскіх — яшчэ тым, што мусульмане - Беларусы здольныя да навукі; з пасярод іх выйшлі ведамыя навучоныя, прыкл. тэорэтык коопэрацыі Туган-Бараноўскі.

Важнейшая літаратура аб беларускіх мусульманах.

Bartoszewicz J., Tatarzy polscy („Encykl. powsz.“, т. XXV, Варшава. 1867).

Wójcicki K. Wł., Dokument Kierdeja o lustracji Tatarów z r. 1631 z metryki litewskiej („Teka Wileńska“, т. VI, 1858).

Гембіцкі Яхыя. Да пытаньня аб соцыяльна-экономічным стане Беларускіх Татар у сярэднявеччу. Беларуская Акадэмія Навук. Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук. Працы клясы гісторыі. Т. III. Менск. 1929.

Dziadulewicz St., Herbarz rodzin tatarskich w Polsce. Вільня. 1929.

Мухлінскі А., Zdanie sprawy o Tatarech litewskich („Teka Wileńska“. 1858, т. 4).

„ Изслѣдованіе о происхожденіи и состояніи Литовскихъ Татаръ. Пецярбург. 1857.

Rocznik Tatarski. Вільня. 1932.

Syrokomla Wł., Wycieczki po Litwie w promieniach od Wilna. Вільня, 1857.

Talko-Hryncewicz J., Muślimowie czyli tak zwani Tatarzy litewscy. Кракаў, 1924.

Янчукъ Н., О литовскихъ Татарахъ („Труды Антр. Отд.“. Масква. 1897).

[1]) Rocznik Tatarski. Вільня. 1932, бал. 202

II. Беларуская літаратура арабскім пісьмом.

а) **Гісторыя.** З гісторыі беларускіх мусульманаў ведаем, што, пачынаючы прынамся з пачатку XVI стагодзьдзя, была ў Беларусаў ладная літаратура арабскім пісьмом (арабскімі літарамі). Красаваньне яе прыпадае на XVI ст., значыцца на час найвялікшага развою агульна-беларускае літаратуры. Можна думаць, што ўжо ў XV стаг. была ў Беларусаў некаторая літаратура арабіцаю (арабскім пісьмом). Гэтага можна спадзявацца ня толькі падзеля высокае роўні беларускае культуры ў XV стаг., але й дзеля таго, што ўжо ў XV стаг., асабліва ў другой яго палавіцы, мусульмане ў Беларусі былі ў вялікай колькасьці этнічна й этнографічна Беларусамі.

Дальшая доля беларускае літаратуры мусульманскае была аднолькавая з доляю агульна-беларускае літаратуры. У XVII стаг. развой яе прыпынены ўплывам польшчыны, а ў стаг. XVIII, здаецца, і зусім задзержаны. Як, наагул кажучы, Беларусы хрысьцяне, так сама й мусульмане ў XVIII стаг. не ствараюць новых літаратурных цэннасьцяў, але, перапісуючы ўперад напісаныя кнігі, жывуць культурным багацьцем, створоным прэдкамі іхнімі ў пярэднія стагодзьдзі.

У XIX стаг. пачалося адраджэньне беларускае літаратуры, але літаратура царкоўная, як Беларусаў праваслаўных, так і каталікоў, не адраджалася; наадварот, гэты век адзначыўся ў Беларусі найвялікшым упадкам культуры ў рэлігійным жыцьці. Дык няма дзіва, што ня было адраджэньня царкоўнае літаратуры й у жменькі Беларусаў-мусульманаў. Цікаўна, што імкненьне ў Беларусаў да нацыянальнага адраджэньня ў XIX стаг. праявілася й арабіцаю ў напісаньні ў 1836 г. турэцка-беларускага слоўніка[1]). А ў сваім царкоўным жыцьці беларускія мусульмане пераз усё XIX стаг. перапісуюць, як у XVIII стаг., свае даўнейшыя кнігі, напісаныя пабеларуску, часткава папольску.

Дык беларуская літаратура арабскім пісьмом, хоць і дайшла да нас у ладнай меры ў копіях пазьнейшых, але паўстала ў XVI—XVII стагодзьдзях, асабліва ў першым.

b) **Захаваныя памяткі.** Каб палажэньне беларускага народу ў XIX стаг. было балей меней нормальнае, каб у XIX стаг. была ў Беларусаў навука беларускае філёлёгіі, то бяссумлеву шмат памяткаў стара-беларускае літаратуры арабскім пісьмом было-б уратавана. Але гэтага ня было; наадварот, беларускі народ у XIX ст. быў паняволены й упалы, а чужая навука памагала чужому ўраду ўціскаць Беларусаў і аб захаваньні беларускага культурнага багацьця ня рупілася. Дык хоць яшчэ ў 1858 г. А. Мухлінскі пісаў, што тады ў мэчыцях у Беларусі было шмат беларускіх рукапісаў мусульманскіх[2]), але ніхто ў той час іх ня зьбіраў. Пад канец XIX стаг., здаецца, аб іх чыста забыліся. З гэтае прычыны яшчэ ў XIX стаг. шмат беларускіх кнігаў арабіцаю загінула. Паміж іншым згінуў цікаўны містычны твор „Хікмэт“ (духоўнае размышленьне), з каторага А. Мух-

[1]) Глянь ніжэй на бал. 123 пры пералічэньні захаваных памяткаў беларускае літаратуры арабіцаю.

[2]) Zdanie sprawy..., бал 35.

лінскі ў 1857 г. прывёў гэт'кі адрывак: „Гэй нядужы адамскі чалавек! Астатні час прыйдзе, ніхто табе ня дасьць помачы, як тылька Бог. Як там крычаць будзеш, ніхто тваго голасу не пачуе, тылька Бог.

„Калі-б хацеў уцякаць, ніхто табе дарогі ня ўкажа, да суднага дня ніхто а цябе не папытае, тылька Бог. Мешканьне яко маеш мець, ніхто не абачыць, тылька Бог. Піць-есьць есьлі хочаш, ніхто ня дасьць, тылька Бог" [1]).

Адно калі ў XX стаг. паўстаў беларускі рух, зьявілася беларуская інтэлігенцыя і беларуская навука, былі знойдзены старыя, забытыя, але дарагія кнігі беларускае літаратуры арабскім пісьмом.

Наўперад быў знайдзены „Аль-Кітаб" Беларускага музэю Івана Луцкевіча ў Вільні. Знайшоў яго 1915 г. ў Сорак Татарах пад Вільняй беларускі дзяяч, археолёг Іван Луцкевіч (1881—1919 г.), заклад- чык Беларускага Музэю ў Вільні. Знойдзеную кнігу Ів. Луцкевіч аддаў у менаваны Беларускі музэй у Вільні, названы пазьней яго іменем.

„Аль-Кітаб" або проста „Кітаб" паарабску значыць „кніга". У беларускіх мусульманаў гэтак завуцца кнігі рэлігійныя, у каторых зьмешчаны выясьненьні малітваў, абрадаў, пастоў, апавяданьні з жыцьця Магамэда й пракокаў, рэлігійныя лягенды і на'т напару проста ўсходнія казкі.

Калі беларуская прэса разьнесла весьць аб гэтым „Аль-Кітабе", то беларускай літаратураю арабіцаю зацікавіўся навучны сьвет. Тады проф. пецярбурскага ўнівэрсытэту Крачкоўскі (Беларус) знайшоў (1920—21 г.) у бібліётэцы гэтага ўнівэрсытэту 4 кнігі, пісаныя пабеларуску арабіцаю: 2 зборнікі малітваў і 2 пераклады Корану. Запісаны яны былі ў каталёзе, як польскія, бо ўкладчык каталёгу, барон Розэн, ня знаў ані беларускага, ані польскага языкоў[2]). Рукапісы бібліётэкі пецярбурскага ў-ту паходзяць з XVII стаг.

У 1925 г. ў бібліётэцы духоўнае сэмінарыі ў Пскове знайшлі колькі арабскіх рукапісаў. Паводле дагэтулешніх ведамасьцяў, гэныя рукапісы маюць прыпіскі словаў у беларускім языцэ. Аднак ня вылучана, што пры бліжшым разглядзе акажуцца ў іх цэлыя часьці беларускія.

У 1926-7 г. ў Радавай Беларусі знайшоў адзін „Кітаб" беларускі Віталь Вольскі. Ён-жа яго й транскрыбаваў. Адна повесьць із гэтае кнігі ў кірылічнай транскрыпцыі была надрукавана ў часапісе „Узвышша" № 4 з 1927 г., *бал.* 135—146. „Аль-Кітаб" В. Вольскага (так будзем яго зваць) пэўне ё копіяй з XVIII стаг. Пры перапісаваньні копіяў (пэўне копія рабілася не адзін раз) беларуская мова повесьці, надрукаванай у „Узвышшы", з выняткам аднаго адрыўка, была вельмі сполёнізавана.

Аб Аль-Кітабе мэчыці ў Крушынянах, Горадзенскага павету, напісаным у 1792 г. ў Сандыкаўшчыне Юсупам Эляшэвічам, паведаміў Якуб Шынкевіч у „Roczniku Tatarskim" 1932 г. Там-жа ў лацінскай транскрыпцыі пададзена колькі артыкулаў з менаванага кітабу.

[1])Изслѣдованіе о происхожденіи и состояніи Лит. Татаръ. Бал. 66-68. Тэкст гэтта перададзены паводле цяперашняга правапісу.

[2]) Яўхім Карскі, Бѣлорусы. III—2, бал. 239.

Напасьледак, ладне беларускіх рукапісаў арабіцаю, хоць пазьнейшых копіяў, сабрана ў Муфтыяце ў Вільні. Тутака ё гэт'кія рукапісы [1]):

5 Аль-Кітабаў (з 1771 г., 1836 г., 1837 г., 1885 г., адзін бяз даты);

1 кніга аб тым, як трэба чытаць Коран;

1 рукапіс (копія з 1890 г.) пераклад Корану;

6 зборнікаў малітваў (з 1803 г., з перад 1805 г., 1890 г. і тры без паказаньня часу напісаньня).

1 Слоўнік турэцка-беларускі (з 1836 г.).

c) **Мова.** Захаваныя памяткі беларускае літаратуры арабскім пісьмом маюць вялікае значэньне дзеля іх беларускага языка. Як ведама, стара-беларуская літаратура, пісаная й друкаваная кірыліцаю, мае правапіс чужы — царкоўна-славянскі (стара-баўгарскі). Чужы правапіс не перашкаджаў поўнаму адбіцьцю ў менаванай літаратуры слоўніку й хормаў беларускага языка. Накшая рэч была з фонэтыкаю (гукамі). Праўда, нягледзячы на чужы правапіс, па стара-беларускай літаратуры можна дасьледаваць блізу што ўсе фонэтычныя зьявы беларускага языка, але гэтыя зьявы праяўляюцца часта ў ёй не як штось звычайнае, а, наадварот, як абмылы або водхіны ад прынятага правіла правапіснага, водхіны тым большыя, чым пішучы быў меней асьвячоны ці—начай кажучы—меней навытыраны ў традыцыйным правапісе. Дзеля таго неадумыслоўцу, нефілёлёгу беларуская мова ў старой нашай літаратуры на першы пагляд здаецца якбы чужою, бо апранена яна ў чужую вопратку—царкоўна-славянскі правапіс.

Зусім ня тое знаходзім у беларускай літаратуры арабіцаю. Пісьменьнікі з беларускіх мусульманаў ня былі зьвязаныя царкоўна-славянскаю традыцыяю ў правапісе, навет ня зналі царкоўна-славянскае мовы, а традыцыі арабскае не маглі перадаць правапісу беларускае мовы з прычыны вялікае розьніцы паміж беларускай і арабскай мовамі. З гэтае прычыны пісьменьнікі арабіцаю прытарнавалі апошнюю да гукаў беларускіх, прыдумаўшы ў ёй апрычоныя значкі на гукі *дз* і *ц* ды пісалі так, як вымаўлялі. Дзеля таго ў літаратуры беларускіх мусульманаў адбіліся наагул усе асаблівасьці беларускае фонэтыкі. Маем у кнігах арабіцаю сыстэматычна аканьне, дзеканьне, цеканьне, пераход *л* у *ў* (быў, воўк), пераход *в* у *ў* (галоўка), пераход *у* ў *ў* (навучоны) і шмат іншых. Менаваныя й іншыя асаблівасьці беларускага языка адбіліся так сыстэматычна й багата ў мусульманскіх кнігах, што цяпер звычайны чытар стара-беларускіх тэкстаў арабіцаю мае даймо (уражаньне) сучаснае беларускае мовы, хоць запраўды мова іх ладне розьніцца ад мовы цяперашняе.

Ё яшчэ адна важная асаблівасьць мовы стара-беларускае літаратуры арабіцаю. Урадовай моваю Беларускага Гаспадарства, званага Вялікім Княствам Літоўскім, была стара-беларуская мова літаратурная. Гэта-ж мова ўжывалася й у тагачаснай беларускай літаратуры. Як у кожнай мове літаратурнай і ў ёй асаблівасьці мясцовыя дыялектычныя ў ладнай меры былі сьцертыя. З гэтае прычыны дасьле-

[1]) Rocznik Tatarski. Вільня. 1932, бал. 314.

даваць гісторыю беларускіх дыялектаў даволі трудна па стара-беларускай літаратуры (кірылічнай).

Тымчасам беларуская літаратура арабіцаю напісана мясцовай моваю народнай. Гэта яе недасканальнасьць у прыраўнаньні да агульна беларускае літаратуры, але затое гэта самае дае цяпер нам магчымасьць добра студыяваць па ёй гісторыю беларускіх дыялектаў і тым ляпей пазнаваць усё багацьце беларускага языка.

З вышменаваных прычынаў памяткі беларускае літаратуры арабіцаю вельмі важныя дзеля беларускага языка й яго гісторыі.

d) **Зьмест.** Агульны зьмест беларускае літаратуры арабскім пісьмом быў ужо відаць вышэй пры пералічэньні захаваных кнігаў гэтае літаратуры. Літаратурнае значэньне маюць пераклады Корану, рэлігійныя лягенды і іншыя апавяданьні. Гэтта задзержымся на творах балей меней дасьледаваных кнігаў.

Апавяданьне аб ненаўчоным багамолцу. Напісана яно ў Крушынянскім аль-кітабе, з каторага надрукавана ў »Roczniku Tatarskim« 1932. Ненаўчоны багамолца йшоў у мэчыць. Падарозе была карчма. Калі ён зайшоўся ў карчму, карчмарка замкнула за ім дзьверы і сказала, што выпусьце яго адно тады, калі ён або адзін кухаль гарэлкі вып'е, або з ёю „**волю** ўчыніць", або дзяцё заб'е. Багамолца падумаў, што найменшы грэх будзе выпіць кухаль гарэлкі. Але як выпіў адзін кухаль, другога сам захацеў, упіўся, з карчмаркаю „волю ўчыніў". дзяцё забіў. Адгэтуль падвойная навука: трэба вучыцца й ня піць гарэлкі, бо »карчма шайтанскі дом нячысты, усім грахом галава".

Лягенда аб бедным маладзёну,што стаўся султаном. З »Кітабу" В. Вольскага ведаем толькі гэтую лягенду аб набожным мусульманіну. Быў бедны, але добры й набожны дзяцюк мусульманін. Затое просьле ўсіх бедаў Бог яму памог, і ён стаўся гаспадаром - султаном.

Дачуўся ён, што „спадарычна" [1]) султанова дачка выбірае сабе мужа. Выйдзе яна за таго замуж, хто адгадае ўсе загадкі ейныя, а яна ягоных не адгадае. Затое тыя, што загадкаў ейных не патраплялі адгадаць, былі караны сьмерцяй. Бедны дзяцюк, спадзяючыся Божае помачы, пастанавіў папрабаваць шчасьця. Але ён быў чысты галеча. Дык на зычэньне бацькоў прадаў іх. За грошы, дастаныя за бацьку, купіў каня, а за тыя грошы, што дастаў за матку, купіў кажух, сеў конна і паехаў у сваты. Пад'яжджаючы да султановага замку, ён абачыў на тыне шмат галоваў. Гэта былі галавы кандыдатаў за мужа султанішцы, каторыя не адгадалі ейных загадкаў. Аднак набожны дзяцюк не спалохаўся й сьмела пасватаўся да султанянкі. І запраўды Бог яму памог: ён адгадаў усе загадкі. Із свайго боку дзяцюк загадаў гэт'кую загадку: у матку апрануўся, на бацьку прыехаў. »Спадарычна« султанішка не змагла адгадаць гэтае загадкі і мусіла выйсьці за яго замуж. Ажаніўшыся із султанішкай, добры мусульманін адкупіў сваіх бацькоў. А па сьмерці цьсьця-султана ўсё гаспадарства ягонае дастаў гэты калісь бедны й няведамы дзяцюк.

Прыклад з разгледжанае лягенды (дзяцюк адгадуе загадкі султанішчыны):

---

[1]) паненка, панна.

Заяц, так-жа адна жонка была свавольная, так як ты дзеўка. Бяз мужняга пазваленьня хадзіла, гдзе сама хацела; тады Пан Бог зайцам абярнуў. Мыш также адна жонка была, тая жонка барзда ліхая была, сварлівая, ніколі няўмоўчала і тады Пан Бог мышай абярнуў. Пес также чловек быў і з умарлых людзей саваны, адзежу зьдзіраў, без пакаяньня ўмер; тады Пан Бог псом абярнуў. Чырвоны матыль также жонка была. Тая жонка харашо адзявалася для чужых мужоў, а свайго ня любіла; за то Пан Бог чырвоным матылём абярнуў. Сьвярчок также едын муж быў крыўднік людзкі: ілгаў і крадаў; тады Пан Бог казёлкаю благою абярнуў. Сыч, также адзін гаспадар быў, мордэрства чыневаў над людзьмі; за то яго Пан Бог сычом абярнуў. (»Узвышша" № 4 з 1927 г., бал. 143").

З дасьледаваных дагэтуль беларускіх кнігаў арабскім пісьмом найцікаўшы „Аль-Кітаб" Беларускага Музэю Івана Луцкевіча ў Вільні. Напісаны ён быў у XVI в. ў віленска-ашмянскай мове. Транскрыбавала яго ў 1924 г. ў Празе арабістка др. Марыя Тауэр, а лягенду „Мэрадж'," друкаваную ніжэй, транскрыбаваў З. С. Кадэрмэт. Абое транскрыбавалі пры ўчасьці маім. У разгляданым „Аль - Кітабе", апрача выясьненьня малітваў, абрадаў і пастоў ё пяць лягендаў. Іх мы й разгледзім.

Мэрадж (узьнясеньне). Найвялікшай ё лягенда аб узьнясеньні Магамэдавым на нябёсы, званая паарабску „Мэрадж". Гэта найхарошшая лягенда ў цэлай кнізе. Пачынаецца яна ўступам на хвалу Бога. Далей „Аббасаў сын" расказуе, што яму перадаў сам Магамэд, г. зн. аб узьнясеньні Магамэдавым на нябёсы і падарожжы там па ўсіх нябёсах і раі. Дзеля таго што апавядальнік кажа словамі Магамэдавымі, мы заўсёды маем даймо, бы ён сам нам расказаваў.

Па вячэрняй малітве Магамэд пайшоў у горы. Было цёмна, ішоў дождж і веяў вецер. Магамэду здалося, што настаў судны дзень. Ён думаў аб зямлі й нябёсах і дзіваваўся з магутнасьці Божае, каторы ўсё гэта стварыў. Раптам яму захацелася спаць. Прачхнуўшыся абачыў ён перад сабой 4-х ангелаў. Увесь сьвет быў напоўнены сьветласьцяй.

Наўперад падыйшоў да яго ангел Гаўрыіл, прывітаў яго і на пытаньне Магамэдава адказаў, што ў гэтую ноч споўніцца тое, што абяцаў Бог Магамэду. Дастаўшы надзвычайнага каня, Магамэд паехаў разам з ангеламі. Калі прыехаў да Сынай гары, там абачыў Майсея. Бачыў также тамака прароцкія душы. Яны яго прывіталі.

Гэтак прыехаў Магамэд на першае неба. Бачыў там мноства розных ангелаў. Яны абсыпалі яго сьветласьцяй. Адзін ангел быў із сьнегу й агню. Пяючы ён маліўся за спасеньне прарока.

Як-га Магамэд апынуўся на другім небе. Там было ангелаў надзвычайнае мноства. Калі-б дзе мусульманская вера была ў небясьпечнасьці, дык яны пойдуць і ўсё зьністожаць. На чацьвертым небе бачыў Магамэд Хрыста й Ільлю.

Гэтак ішоў Магамэд да Бога. Напасьледак дайшоў да Божага пасаду. Але мог глядзець на Бога здно „душнымі вачыма", бо людзкія вочы ня могуць Бога відзець. Бог абяцаў Магамэду ўсё даць, чаго ён толькі будзе прасіць. Магамэд прасіў адпусьціць гра-

хі яго вернікам. З вялікім націскам Бог абяцаў спасеньне тым, што належаць да царквы Магамэдавае.

Пабожаму загаду адчыніліся перад Магамэдам райскія вароты, і ён увайшоў у рай. Пераходзе тамака з пакою ў пакой. Драбязна расказуе, што там бачыў. У пакоях сядзяць райскія паненкі. З вялікай любатой прарок апісуе іх хараство. Ня могуць быць месяц ані сонца так ясны, як іх твары ясныя й харошыя. У раі ё апрычоныя палацы прарокам, мніхам і звычайным мусульманам.

Вярнуўшыся на чацьвертае неба, бачыў Магамэд дзіўную дошку й дзерава, вялікае на ўвесь сьвет. Ля дошкі стаяў ангел сьмерці Азраіл. Калі Бог створа чалавека, дык на тэй дошцы будзе напісана яго імя. З нараджэньнем дзіцяці на дзераве зьявіцца лісток, каторы расьце разам з дзіцём. Калі чалавек памрэ, лісток зваліцца ў рукі Азраілавы.

Бачыў Магамэд такжа пякельнага вайводу, седзячага на ўслоне з агню ля пекельнае брамы. У пекле мучыліся розныя грэшнікі.

На сёмым небе абачыўся Магамэд з патрыярхам Абрагамам, каторы папытаўся ў Магамэда, як ён маецца. Быў тамака дзіўны ангел, маючы 70 тысячаў галоваў.

Стыль лягенды ўрачысты, адпавядаючы зьместу.

Гэтта друкуем часьць разгледжанае лягенды.

Мэрадж [1].

Bismi 'llahi 'rrachmani 'rrachimi [2].

Наўперад 1) Божа імя ўспамінайма, міласьць у нутрах сваіх уфундуем; першы і астатні Он ест вякуісты, да кажнай рэчы моцны, ніхто Яму непадобны, адзіны 2) ест. Яшчэ нічога ня было, стварыў сьветы, людзі, яшчэ да людзей падобна фэрый і дзівы; стварыў зямлю і неба, людзей і ангелы, месяц і слонца і зьвезды, семкрот нябёс. За расказаньнем месяц і слонца узыйдзе і зайдзе, рассудку яго кажны трымае. Потым месяц і слонца зьвяжа парсуну, дасьць яму розум і міласьць і вядомасьць. Навука ест такжа і твая: пей салават [3]) прароку, гэй браце, прароцкаму мэраджу [4]) трымай вуха.

Успомнем мэрадж прароцкі. Калі ўчуеш, рада будзе ўся душа. Мовіў Аббасаў сын тое слова, ведамасьць дае прарок яму сам. Прарок мовіў: „Скажу, што ся дзеяла; сын Аббасаў, выслухай мяне.

Адкланяўся ўночы етцы намаз [5]), вышаў з дому, хадзіў памалу.

[1]) Гэтую лягенду друкуем дзеля цікаўнага зьместу ейнага. Дык, маючы наўвеце шырокае грамадзянства, дзеля лягчэйшага чытаньня, тутака яна друкуецца паводле сучаснага правапісу. Мову, як фонэтыку, так і хормы словаў, пакідаем бяз зьмены. Слоўнік таксама не мяняем, але полёнізмы замянілі словамі беларускімі, паказаўшы ў канцы, як было ў варыгінале. Гэта таксама прычыніцца дзеля лягчэйшага чытаньня й разуменьня. Арабізмы пакідаем, бо яны згаджаюцца з мусульманскім характарам лягенды. Затое ў вынасках даем пераклад арабізмаў.

[2]) выражэньне арабскае, пераклад: У імя Бога міласэрнага, міласьцівага.

[3]) араб.; кароткая малітва на хвалу прарока.

[4]) узьнясеньне, араб.

[5]) вячэрная малітва.

Цемна было, вочы сьветласьці ня відзелі, куры ня пелі, сабакі не брахалі. Дождж ішоў, цемна было, вецер веяў. Разумеў, што судны дзень настаў. Межы Сафа і Мэрва[1]) хадзіў, мысьлячы межы іх стаяў. А зямлі, а нябёсах мысьліў, моцы Божай дзіваваўся, казаў: „І што ест моцны, праўдзівы Пан, як стварыў зямлю і нябёса на паветру!

У том умысьле спаць мне захацела (сын Аббасаў, выслухай гэта слова!) Потым ачнуўся. Скора глянуў на чатыры стараны, чатыры ангелы ўвідзеў: кожны ў руках па харугве 3) дзяржаць. Гэты ўвесь сьвет у сьветласьці стаў, гэты сьвет напоўніўся сьветласьці з канца ў канец, блеск 4) паў на гару, на каменьне. З небам была роўна кажная харугаў. Уперад прышоў Джабраіл [2]) даў селям [3]). Глянуў Джабраілу у твар, месяц, слонца зацьмела; месяц і слонца зьмянілі парсуну сваю. Ад зямлі да неба аперлася велічыня яго. Напісана ест перад ім два сатыры: [4]) „Нямаш іншага Бога, толькі 5) Аллаг імя яго моцнага!“ Блеск 6) б'ець другога сатыра. „Яўно, што 7) Мухамэд пасол Божы, Мухамэд прарок імя“.

Шэсьцьсот крыльля, семдзесят-сот 8) год кажнае крыло, семсот полкаў яго было валасоў, пэрла, дарагія каменьне на кажнам канцу з твары 9) харошай і голасу; з чырвонага акіку [5]) было на ём адзеньне.

Пытаў я на потым: „І браце Джабраілу, чы ўжо трубіў у трубу Ісрафіл, чы прыказаньне Божае нам аднавілася? А ўсём мне дай знаці і ведаці; гэта ноч, што за ноч, скажы мне?“ Джабраіл мовіў:

Адрывак лягенды «Мэрадж» з «Аль-Кітабу».

[1]) горы ў Арабіі ля Мэккі.

[2]) ангел Гаўрыіл.

[3]) даць селям—прывітаць, сказаць „Salamun alaikum“=супакой табе!

[4]) радкі.

[5]) араб. акік—камень.

„Семенчуй [1]) табе, прароча, Мэрадж ноч ест; прароча, не фрасуйся, нутр трымай вясёлы 10). Тая абятніца, што абяцаў Праўдзівы табе, дойдзеш гэтай ночы да тае абятніцы. Што табе даў, нікому таго ня даў: аўлія [2]), пракорі ня ведалі, а стварэньне цябе павялічыў, ад усіх цябе пажадаў. Ест ты Божы мілосьнік, і Мухамэду, ад цябе нам усім прычына мае быць. Устань, прароча, апашыся, блізка мейсца маеш мець ку Пану Богу, абачыш Пана Бога аблічнасьці, што захочаш, усё абачыш. Прыбярэ 11) для цябе нябёса, радуецца, што ўвідзеў прарока. На сямі нябёс што ест ангелей харошай твары, хочуць відзець, жадаюць, просяць Пана Бога за цябе, дуаі [3]) пяюць усе за душу тваю".

Скора ўчуў ад Джабраіла тыя слава, зарадаваўся, твар на зямлю палажыў. Пацягнуў адзеньне, штоб надзеў. Джабраіл мовіў: „Што чыніш, і душа прароча? Сегасьветнага адзеньня з табой ня трэба ест. Расказаньне Божае мне: „Вось 12) прыслаў табе іншае адзеньне, нічога ест працiў гэтага атлас". Двое адзеньне ўзлажыў на мяне зялёнае, з моцы сваей стварыў тое Пан Бог, із сьветласьці тыя абое стваронь, блескам 13) напоўніўся ўвесь сьвет. Скора надзеў на сябе тое адзеньне, за уммет [4]) свой вельмі клапаціўся 14). Я мовіў 15): „Іж то ест стварыцель Пан Бог, чы будуць насіць уммет такое адзеньне?" Голас прышоў да вуш тае-ж гадзіны: „Просьба прынята твая, прароча".

Потым да вады прышоў земзем [5]). Два ангелы ўказаліся прад вочы, кожны ў руцэ кубак 16) дзяржыць, у вадном земзем вада, а ў другом кеўсер [6]). Абдас [7]) узяў, разьліваючы тую ваду. Хто умметам маім, абдас узяўшы, ляж спаць рукі злажыўшы.

Стаяў Джабраіл, прышоў у том часе Мікаіл[8]); дзяржыць у правай руццэ аднаго каня — брух жоўты, шыя зялёная, персьці белыя, плечы з крышталу, капыта за срэбра (той быў усіх коняй панам), зубы мэрджан[9]), язык з імбэру, валасы, вушы із яханту, персьці конськія, твар падобна чалавеку, пэрла або каменьне дарагія абадва воч, хвост паві, як дарагі камень, з абодвых старон белыя скрыла 17) з пэрлаў із дарагога каменьня, так з пэрла каштоўнага вуздэчка, із сьветласьці. Хто салават[10]) пяець, на судны дзень усьсядзе.

Рукамі дакрануўся да карку ўсьсесьць; адным разам скочыў ад мяне; як скача рыба ў сеці, так выскачыў з рук маіх. Джабраіл мовіў: „Што чыніш, гэй коню, устыдайся, прарок стаіць наш, дайся дасесьць прароку, уцішся, слухай маго слова: за 18) яго лепшы на цябе ня будзе ўсьсядаць; калі ён на цябе ўсьсядзе, цела у пекле ня будзе гарэць, харамам [11]) будзе табе пякельная мука, дайся дасесьць

[1]) слова незразумелае; паводле паралельнага татарскага тэксту, значыць „прысмная неспадзеўка".
[2]) сьвятыя.
[3]) араб. дуа—прашэльная малітва.
[4]) араб. уммет абазначае царкву й вернікаў.
[5]) назоў аднае сьвятое вады.
[6]) напітак.
[7]) араб. абдаст—умываньне.
[8]) ангел Міхаіл.
[9]) белы дарагі камень.
[10]) род малітвы, гл. бал. 18.
[11]) творны адз. ад араб. х а р а м—тое, што забаронена.

прароку!" У том часе той конь пачаў мовіць, за воляй Божай мовіў да Джабраіла, мовіў: „Слова майго слухай, і Джабраілу, не ўсьсядаў на мяне Ібрагім[1]), прыяцель Божы, і твой Ісмаіл неўсьсядаў, ты ведаеш астатнюю ведамасьць, як мае быць". Джабраіл мовіў: „І коню, розум твой гдзе, то прарок двох сьветоў- Пан для яго стварыў сьвет; што кольвек ест яўнага й тайнага ў Пана Бога, за яго лепшага нямаш, вера яго ест, гаспадара кабайны [2]) то ест. Скора ўчуў тыя слова той конь, заўстыдаўся, аж яму пот пацёк. Мовіў: „Калі ён усьсядзе, тым спосабам на судны дзень мае за мяне прычыняцца і там тож 19) канём я яму буду, на век вякоў канём яму буду, і там тож 19) ён на мне езьдзіць будзе, на век вякоў канём яму буду". Потым уцішыўся, усьсеў я на яго. Пей салават, і табе Пан Бог судзіць пець! Скора усьсеў на яго, распусьціў крыльле. То ахота, то ест міласьць, то ест годнасьць.

Цяпер чуў азнайменьне як ходзіць: кожны ступень на міль дзевяцьдзесята йдзе. Час па зямлі хадзіў, час па небе ляціць, ні гор, ні каменьня, ні даліны не глядзіць: даліна прыйдзе, дастануць ногі, гара прыйдзе, такжа пастараму; горы, даліны—усё яму роўна было; разумеў, што 7) прад нім роўна было.

Едучы крык зайшоў раз і другі: „І Мухамэд, стань, умметоў [3]) тваіх слухай тых слоў!" Бурак [4]) не затрымаўся на мейсцу. Адтуль рушыўся, яшчэ крык зайшоў: „І Мухамэд, слухай слоў маіх!" Я мовіў: „І Джабраілу, хто то ест?" Джабраіл мовіў: „Умметам тваім хоча быць: то храсьцянін, а другі жыд прычыны жадаюць тваёй і рады; дай пазнаку ім прычыны сваей, калі хочаш, што-б былі тваім умметам".

Паехаў далей, відзеў адну жонку 20) харошую; дзіваваўся гледзячы на яе парсону. На яе парсону гледзячы, у задзівеньню стаў, відзячы твар яе. Джабраіл мовіў: „Не глядзі на яе, прароча, каб 21) якая труднасьць не дайшла цябе". Я мовіў: „Гэта хто ест, і Джабраілу?" Джабраіл мовіў: „Сёй сьвет то ест праўдзіве: хто у тое верыць, у вагні гарыць, розныя, розныя мукі відзець будзе; хіба прычына знову ад цябе будзе, Пан Бог ім ласку ўчыніць". То вымавіў Джабраіл і борзда 22) пашоў, як вокам мігнуць да Сынай гары прышоў.

Скора прыехаў да Сынай гары, борзда ісьсеў із каня ў том часе на зямлю; два рэкеаты [5]) борзда кланяўся намаз. Раз мовіў тайна просьбу ку Пану Богу: „Хвала Пану Богу, што 7) мяне прынёс да гэтай гары" Патрымаў Джабраіл, борзда усьсеў на каня. Там ляжаў Імранаў сын Муса[6]). Я тож 19) гуляў у Бэйтулмукаддэсу[7]). Там-жа відзеў прароцкія душы, селям мне ўсе далі. Усе прышоўшы селям далі [8]), сафі, сафі [9]) праціў 23) мяне сталі. Джабраіл мовіў:

[1]) Абрагам.
[2]) прымета ўтв. ад араб. к а б а, к а б а й—сьвятыня ў Мэкцы.
[3]) вернікаў.
[4]) пататарску b r a k—часіна.
[5]) араб., азначаны час малітвы.
[6]) Майсей.
[7]) сьвятыня ў Ерузаліме.
[8]) прывіталі.
[9]) саф—рад, сьцяг; араб.

„Гэй, прароча, пытай у іх, навуку чы давалі кяфірам [1]), чы навучалі кявернікаў, што 7) мовілі: „Пан Бог убогі, а мы багатыя“. Гэй, прароча, яшчэ кяфіра мовілі: „Іса[2]) сын Божы“ мовілі. Яны мовілі: „Чысты Пан Бог, прароча, Пан Бог адзіны 2) стварыў яго халопа. Хто у Яго адзіностве сумляваецца 24), то ест кяфірын, кяфірськае яго ест. Ты, калі праўдзівы, пей салават, знайдзеш у Пана Бога ласку. Навуку давалі ім, ня слухалі, у Божае адзіноства ня верылі, шайтанськую[3]) навуку дзяржаліся, душы свае да пекла ўкідалі, кожнаму з нас муку чынілі, некаторых за халап‘ю прадавалі, некаторым галавамі ў піліну ігралі, у сём нам такую муку чынілі. Кожны з ніх сваю рэч мовіў, жалаваліся, на кяфіраў скаржыліся.

Потым Джабраіл мовіў: „Мне Божае расказаньне ест, скажу табе, тут два рэкеаты намаз трэба ест, прароцкія сьлёзы уцерць трэба“. Два рэкеаты намаз там кланяўся, прад сябе глянуў, чатырох ангелаў відзеў. Адзін палумісак у руках дзяржаць, з місы сьветласьць да аршу[4]) блеск 6) ідзець. У той місе былі тры кухлі для мяне засланы ад Пана Бога. У вадном кухлю вада, у другом малако, у трэцем віно. Хто віно п'ець, душу сваю сіляе. Джабраіл мовіў: „Прароча, то табе Пан Бог заслаў, прароча, табе“. Пасягнуў—малако з кухлем да рук прышло; піў, адно на сподзе троха застала. Джабраіл мовіў: „Калі-б выпіў усё, уммету [5]) твайму харамам [6]) было пекла“. Я мовіў: „Раскажы, няхай прыйдзе, вып'ю, уммету свайму райськія варота адчыню“. Джабраіл мовіў: „Так веле часьць тое выпіў, то ўжо стала часьць твая“.

Пашоў адтуль, пусьціўся да мэраджу. Паслухай якая ест Божая моц; скажу табе, што ест мэрадж, будзеш знаць Божую моц. Як маю вымавіць, што-б знаць мэрадж? ногі на зямлі былі, а ў небе канец. Адны ўсходы былі так вялікія. Дзьве стараны ангелаў поўна было; ногі іх пэрловыя былі, іншых д'ямэнтовыя, іншых з крышталу, іншых за злота, іншых за срэбра. Я не кажу, прарок яго мілась так кажа. Кажны майстат розны блеск 4) выдае, адзін аднаго сьветласьцяю асьвячае. На правай старане былі ангелы ў лічбе чатыркрот па сто тысячай; у кажнага ў руках па палуміску сьветласьці дзяржаць, хораша салават пяюць, сэджэ [7]) кланяюцца; радуючыся адзін другому семенчуюць: „Вось-жа 25) прышоў той 26) прарок!“ Зікір тасьбіх[8]) пяючы, вышаў к небу, адзінага 27) Бога рамясло ўспамінаюча. Пяцьсот год дарогі грубасьці таго неба. Пей салават 28), скажу табе: з дыму стварона першае неба, у кітабе [9]) Рафаа[10]) імя. Адны варота відзеў, імя Хафіз [11]), брамы, вежы—усе сьветласьць.

[1]) араб. кяфір—нявернік.
[2]) Ісус.
[3]) ад араб. шайтан—чорт.
[4]) арш—пасад.
[5]) царкве.
[6]) забаронена.
[7]) паклон да зямлі.
[8]) род малітвы.
[9]) кнізе.
[10]) араб., зн. „вышыня“.
[11]) Старожа.

Прышоў Джабраіл, у варота ўдарыў. Із сярэдзіны голас прышоў: „Хто ест?“ Рэк: „Я ест, чы ты ест? Джабраілу варота адчыні, увайду“. Ісмаіл рэк: „Водле 29) цябе хто ест, скажы мне?“ Джабраіл мовіў: „Семенча[1]) няхай табе, пры мне прарок, пахвальнасьць сьвета, той, што імя пішучы, зламалі калям[2])“. Адзін ангел прышоў, варота адчыніў, семдзесят тысячай ангелай з нім высыпаліся; вітаючы цябе 30) крыкнулі. Кожны з ніх па адном палуміску сьветласьці пасыпалі.

Скора з варот у сярэдзіну увашоў, розныя, розныя ангелы, гэй таварышу, там відзеў. Адзін ангел сядзіць, семкрот па сто тысячай паправе стаяць, семкрот па сто тысячай па левай старане стаяць; чатыроста рознымі імёнамі ўспамінаюць Пана Бога; ласку ўчыні ўсім, Ты вячысты Божа! Тыя ангелы на зямлю іступяць, у вадамськіх дзяцей грахі бяруць.

Пашоў адтуль, гуляў па вежах, разглядаў усе зьвезды, кажная так сафамі, сафамі [3]) завешана, кажная за сегасьветную гару большая. Там-жа відзеў адзін ангел вельмі дзіўны, з моцы сваей стварыў яго Пан Бог: палавіца із сьнегу, палавіца із агню, розныя тасьбіхі [4]) з языкоў ідуць. Сьнег агню помачы не загасіць, ані агонь сьнега не растопіць, абадва так у стаяньню ест. Віж Божую моц, што ест. І мові, гэй таварышу: „Учынюшчы сьнег агню, ласку учыні над умметам Мухамэда!“ „Пей салават спасеньню прароцкаму!“ — тасьбіх [4]) то ест таго ангела.

Пашоў адтуль на другое неба. Як слова мовіць мне ся здала так. Із зялеза 31) стварыў неба другое Пан Бог, што ўробіць, будзе гатова. Наурэ другому небу імя. (Пей салават, прарок так мовіў!) „На другом небе ангелаў многа, не магу мовіць, бо лічбы нет. Калі чалавек курбан[5]) рэжа, тагды яны на коні ўсьсядаюць, кажды на галаву карону ўзложыць, у руках дзяржаці булавы, а языкамі пецімуць тасьбіх. Хто-бы мусульманськую веру здаваў, яны пашоўшы усіх у нівэч абернуць. Скора абачыў, селям ім даў; яны прыняўшы твары свае на зямлю палажылі.

Пашоў адтуль на трэцяе неба. Заставіў каня на воку мгненьню, прынучы мяне Пан Бог праўдзе. Трэцяе неба Пан Бог стварыў за срэбра; Заіра імя, а самое за срэбра; у сярэдзіні так поўна ангелаў, кажны з боскім расказаньнем у вадном дзеле. Такі чалавек, што добрыя ўчынкі чыніць, то яны таго ангелы ест; іншыя, што зекат садаку [6]) даюць; іншыя — боскіх прыяцеляў мусульман; іншыя також Божых баязьнікаў; іншыя, што Кадыр ноч [7]) сядзяць. Там-жа я відзеў Юсуфпрарока [8]), сьветласьць твары яго нябёса асьвяціла; із сьветласьці адзін пакой стаяў, мовіў, як месяц стаяў. Прышоў да яго, селям яму даў; ён, мяне паткаўшы, павяльбеньне мне чыніў.

[1]) прыемная неспадзеўка.
[2]) пяро; ё лягенда, што калі ў небе пісалі імя Магамэдава, дык зламалася пяро.
[3]) тв. скл. ад с а ф.—рад.
[4]) тасьбіх—малітва шмат разоў паўтараная, падобная да хрысьціянскага ражанца.
[5]) жэртва із жывёлы.
[6]) садака—убожына, зекат садака—убожына із саракавое часьці заробку.
[7]) 27-ая ноч посту Рамазан.
[8]) Язэпа сына Якубовага.

Пашоў на чацьвертае 32) неба з добрым гуляньнем, таварышам быў Джабраіл пры мне. З дыму стварыў Пан Бог чацьвертае 32) неба, Гэты 26) паважны, Гэты 26) міласэрны 33), Гэты 26) моцны. Чацьвертага 34) неба імя Мазіна. (Дзіўныя рэчы скажу, паслухай яшчэ). Тамжа — відзеў — сядзелі два младзенцы (хто яны ест, скажу, толькі 5) слухай) твару харошага 35), бы 36) месяц; адзін Іса [1]), другі Ях'я быў. Казалі: „Шчасьлівы будзь, пане наш! цябе абачылі, рада стала душа наша". Яшчэ відзеў аднаго ангела страшнага, на крэсьле сядзеў смутны. Пан Бог яго як стварыў, разу яшчэ не сьмяяўся, жаднага дня вясёлым ня быў. Семкрот зямлі й неба ўсе межы двух лядзьвей стаяць у яго, зямля й неба межы двух лядзьвей стаяць; хто-б мне ня верыў, кяфірын ест.

Пашоў адтуль, трапіў да Ісрафіла. Арш [2]) то ест Ісрафілаў мейсца ад сямікрот зямлі ніжэй ногі яго. Также й трубу ў руцэ дзяржыць, труба, як семдзесят сьвятоў. Яшчэ ў трубе дзірак так веле, як веле на сём сьвеце стварэньня. Я кажу 37): „Што то за мейсца, Ісрафілу"? Мовіць 38): „То ест арш, прароча, стварыў сьветласьць, стварыў той 26), як у Коране мовіць 38): „Ест то арш вялікі, Пан Бог справіў". Потым глянуў на адзінага Бога арш — абадвымі ачыма не глядзеў—усё ангелы. Семдзесят тысячай нябёс ест на аршу зялёных, а на сямі нябёсах вісіць адна вялікая лятарня. Паслухай-жа аднае лятарні страху, хто мае знаць, як неба вялікае. Калі-б семкрот зямлі й нябёс забраліся і ў той лятарні іх паставілі, у вадной палавіцы, так веле яе знаці, як на чалавечым твары 39) знакі або бародаўкі. Чы ня чуў, як рэк той 26) моцны Пан; арш спамянуўшы, мовіць 38): арш вялікі. Яшчэ відзеў подле аршу, гэй паша, адзін ангел падобны птаху. Той ангел свае крыла 17) распастрэ, як ночы тры часьці пярэйдзе; адно аб адно крыло ўдарыць і крыкне і Божыя імёна пяе. На тых, каторыя зікір тасьбіх [3]) пяюць, крычыць: „ Чаго ляжыце—мовячы так крычыць — уставайце, Пан Богу 40) хвалу чыніце, адзінага Бога імя ўспамінайце!" *крыло адно аб адно б'ючы, ночных намазкараў* [4]) будзіць. Потым яшчэ раз крыло ўдарыць адно аб адно, як веле голасу ест, раз крыкне, сьпячых усіх абудзіць: „Уставайце кланяціся ночны намаз, паклон чыніце Пану Богу статэчне, ночны намаз пейце, адпушчаны грахі будуць, як умраце, у магілах вашых сьвяча будзе!" Прад сабахам [5]) яшчэ раз крыкне, на семкрот зямлі й нябёс голас зайдзе. Што крыло аб крыло б'ючы кур пяе, то ўсё яго ест прыклад той: „Уставайце, набожныя людзі, адлучайце ад нутроў сваіх сны, абдас [6]) бяручы, Пану Богу сэджэ [7]) чыніце; як то вы ляжыце ў сну, у том ласкі Божай шукайце". На тых трох рэчах яго Пан Бог старшым 41) учыніў, Гэты адзіны 42). Мовіў, што7) то аршовы кур—паруску

[1]) Хрыстос.

[2]) пасад.

[3]) род малітвы.

[4]) з пэрскага н а м а з (=малітва) паўстала ў беларускіх мусульманаў слова з беларускім суфіксам—н а м а з к а р(=багамолца).

[5]) сабах—раніца.

[6]) умываньне.

[7]) зямны паклон.

певень ест — калі пытаеш імя, ест Мекаіл. Потым аршовы муэзьзін [1]), ночы азан [2]) пяючы, мяне бавіў да сябе.

На аршу, як веле ест ангелаў, усе зараз на адно мейсца забраліся. Пашоў, перад нім стаў імамам [3]) два рэкеаты [4]) намаз пакланіўся 43). Скора направа й налева селям даў, з высокасьці мне адзіне голас прышоў. Борзда 44) на Рэфрэх [5]) усьсеў, яшчэ ехаў, ехаў, страпіў да таго, што мяне клікаў. Адзін ангел мяне клікаў: „І Мухамэд, хадзі да мяне!" мовіў. Таго ангела крыла 17) зялёныя. Потым і запоны перайшоў на арш, семдзесят раз перайшоў, семдзесят тысячай запон, а ўсё размавіта рэч дзіўная. Ад кажнага запону да запону пяцьсот год дарогі ходу вялікасьці.

Скора перайшоў тыя запоны, голас прышоў: „І Мухамэд, хадзі сюда! і Мухамэд, ты Мой, а Я твой ест 45), зямля, неба—усё тваё". Той голас як учулі вушы мае, ня знаю як мае ногі ішлі. Кажны ступень пяцьсот год хадзьбы дарогі, на аршу хадзеньне маё такое было. Так блізка прышоў, што нічога не застала межы намі: ані заслоны межы намі ня было, ані запоны, стварыцеля Бога аблічча відзеў дзіўне, яўна стала перада мной Божае аблічча, але зроку ня стала ў вачах маіх. Сьвецкія вочы Божай парсоны не магуць відзець, моцны Пан Бог ачом зрок дае. Душнымі ачыма відзеў таго чыстага Пана Бога, Каторы мяне стварыў. Скора абачыў, сэджэ [6]) ўчыніў, зараз у том часе сеў аттахіяту [7]). Пан Бог мовіць 38): „І посьле, узьнімі галаву, што табе трэба, усё ў Мяне гатова, і посьле, чаго жадаеш, прасі, дам табе, чаго будзеш жадаць ад Мяне". Рэк: „І Божа, просьба мая — уммет мой, адпусьці ім грахі, то ест ад Цябе жаданьне маё". Мовіць 38) Пан Бог: „Хто будзе трымаці справы твае, Я яму ўчыню ласку Сваю. Также той мае быць тваім умметам, хто да сьмерці ня будзе апускаць суннат [8]) твой; твой суннат калі будзе трымаць, а Мой фарз [9]), то Я яму харамам [10]) учыню пекла. Хто прыйдзе да цябе і рачэ: „Посьле Божы!", райськія істравы 45а) той мае есьць. Хто пяць вахтаў [11]) намаз заўсёды 46] кланяецца, у раю пакоі вышшыя будзе мець; хто у мяне ўставічне верыць, яшчэ лепшы пакой рашшыру і рызку [12]) ім лёгка 47) дам. Калі захоча, скарбу ім прычыню. Скора скарбу *пабольшае, да хаджжу* [13]) пойдзе, другі ўчынак будзе зекат [14]) даваць. Калі ён адзін раз дасьць, Я яму дзесяць дам, у раю яму адзеньне дам. Хто-бы маіх халапоў галодных карміў або нагому ка-

[1]) той, што пяе азан.

[2]) пяцьцё, гукаючае на малітву.

[3]) стаяць імамам—стаяць наперадзе, адгэтуль імам—духоўнік, зн. наперадзе, разумеецца „стоячы".

[4]) час малітвы.

[5]) часіна, мамэнт, гэтта назоў каня.

[6]) зямны паклон.

[7]) сецня на куркішках.

[8]) права Магамэдава.

[9]) закон Божы.

[10]) твор. адз. ад араб. х а р а м—забаронена.

[11]) араб. „вакт" — пара, раз; ё пяць пораў або разоў у дзень, у каторыя мусульмане павінны маліцца.

[12]) араб. „рызк"—маемасьць, штадзенны хлеб.

[13]) хадж—падарожжа ў сьвятыя месцы, араб.

[14]) 40-ая часьць заробку, даваная старцом.

шулю даў альбо надзеў, такім людзем дараваць буду райськім адзеньнем і каронаю, за галоднага карменьня тысяча платы дам, калі чаго баяцца, будзе вызвален... За кім ты будзеш прычыняцца, Я учыню ад пякельнага агню вольным, таго вольным учыню. Не сумлявайся 48) а Маём адзіностве 49]. Салават [1]) хто будзе пеці табе, пэўне ведай — грахі з яго змыюць; ласку Сваю ад іх не адлучу, агіды ў твар іх ня ўдару; з добрасьці сваей зьмілаваньне ўчыню: хто вінен, хто ня вінен не пазнаеш..

Потым мяне Джабраіл абачыў. Джабраіл, за руку мяне ўзяўшы, хадзіў: „І Мухамэд, увашоўшы тут абачыш". Потым мне варота паказаў; зямля і неба поўны сталі сьветласьці... із сярэдзіны сьветласьць пасыпалася. „Бісмі'ллягі" [2]) рэкшы, увашоў у рай. Паслухай як там было. Увашоўшы ў рай, хадзіў там з пакою да пакою, гуляючы радаваўся. Адзін ад другога вышэй тыя пакоі. У пакоях панны райськія сядзяць. Ня можа быць месяц ані слонца так ясна, так іх твары ясныя й харошыя. У кажнай на галаве із сьветласьці карона, месяц, слонца ня так ясны: сонечнае сьветласьці 50) на сьвеце мала будзе, такжа й месяц як у хмары будзе. З тых панен калі-б адна палец свой указала на сьвет або ногаць свой, ад палца яе сьветласьці быў-бы ясны сёй сьвет з канца ў канец. Палцам падобны такжа цела іх, у жылах відаць кроў іх. Кажная семдзесят адзеньня на сабе носіць, а кажнае адзеньне іншага калёру: семдзесят жмуткаў у касах валасоў із фіжмай у розных пахах 51). Станы іх субтэльныя, вочы харошыя, устыду задаюць зьвездам. Такжа слова іх мертвага 52) ажываюць. У роце сьліна—вада жывушчая.

Тых высокіх палацаў паслухай высокасьці як ест: ведай пэўне —за нябескія зьвезды яшчэ вышэй 53) у лічбе сто дваццаць чатыры тысячы. Кажны палац, як на сьвеце гара вялікая, а ў сярэдзіне райськіх панен поўна. Каменьне якія ест, Пан Бог знае, ня можа язык выпаведзіць. Злота, срэбра, дарагія каменьне, ясная ад дарагога каменьня. Ніхто тых палацаў не будаваў і гліны работнікі не дапталі. У кажнам палацу адзін майстат із шмарагду паставены. Для прарокаў стварыў то Пан Бог, Он паважны, Он міласэрны 54), Он багаты. У кажнам палацу на браме напісана: то ест таго й таго сына палац. Яшчэ пакоі ест над тымі пакоямі, у лічбе чатырыста і сорак і чатыры палацы. У кажнам палацу семдзесят тысячай пакояў ест 55), у кажнам пакою адзін майстат стаіць. Райськія панны на ніх сядзяць. Шайхове маюць там быць, у том раю маюць мешкаць. А пад тымі яшчэ мусульманськія, з белага пэрла пакоі іх. У кажнам пакою паслана сьветласьці каберцы. Мусульманін прароку пей салават. Аднаго мейсца таго нямаш, ня відзеў у раі каб 56): і ў сярэдзіне й зьверху так ест ведаю.

А ля тых пакояў сады, агароды, пясок фіжмовы, трава шафрановая; садовіна непадобная гэтай садовіне 57). дзерава ўверх карэньнем, а ўніз садовінай 58). Да аршу [3]) таго дзерава карані, тры-

---

[1]) малітва, выказуючая пашану да прарока.

[2]) у Імя Бога.

[3]) пасаду.

мае зямлю й неба й ангелы, арш, то ест райськія раскошы... Калі-б мой язык хацеў в раю вымавіць. непераставаючы мовіў год.

Разгледзеўшы ў раю, вярнуўся назад; ку чацьвертаму 59) небу зышоў. На чацьвертам 60) небе відзеў Бэйтулмаморы, яго сьветласьць месяц, слонца патлуміла. Семдзесят тысячай ангелаў стаяла, у том паслугу чынілі. Семсот тысяча ангелаў перад ім стаяць, усе яго расказу трымаць гатовы. Адна табліца перад ім стаіць, ён уставічне на яе глядзіць. Па правай старане адно дзерава вырасла, увесь сьвет заняло, так вялікае. Як маю казаць, як веле галін: акружылі ўсе нябёса чыста 61). Што адамськія дзеці на сьвет прышлі, прыйдуць, межы двух броў душы стаяць. Я мовіў: „Хто то ест, Джабраілу?" Он рэк: „То ест душаемца Азраіл". Скора абачыў я яго твару 62), зьлекла душа мая, із страху дрыжала цела маё. Селям [1]) яму даў, селяму майго ня прыняў і на мяне жаднай мерай ня глянуў. Голас прышоў тае-ж гадзіны: „І Азраілу, прыймі, селям прароцкі шануй! Як стаіш, так борзда 63) прароцкі прыймі селям, то будзеш ад пякельнай мукі волен". Потым селям мой прыняў мовіў: „Няхай маю душу 64) табе паляцаю, ня мей за зьле, што ня глянуў на цябе, за душу маю прычыняйся на дзень судны". Вельмі 65) я быў забаўны каля тае табліцы, баюся, штоб чыя сьмерць ня прышла. Калі-б я пільне не глядзеў, то-б расказаньне чыстага Бога зламаў. Я мовіў: „Што то за табліца, і Азраілу?" Он мовіў: „Паслухай, будзеш ведаць: што Пан Бог за Адама душы стварыў, то на той табліцы імёна ест. Пан Бог чалавека скора ўпарсоніць, у пакаленьне яго на сьвет пусьціць, то на той табліцы ўсе імёна, а на том дзераве азнаймёна век і рызк [2]), то ест: скора жонка 66) дзіця ўродзіць, то на том дзераве лісток вырасьце; покі дзіця расьце, лісток расьце, рызк і век яго на том лістку напісаны. Скора рызку ня стане, сьмерць прыйдзе, той лісток адарвецца і перад мяне ўпадзе, а я гляну і той лісток абачу, што за чалавек, чый сын быў пазнаю, і пашлю ангелы мае да яго— і прароча, паслухай, што табе скажу—і зыйдуць яго душу браць, людзем смутак-успамінак настаўляць. Калі мусульманін, із правага боку прыйдуць, калі кяфірын [3]), із левага боку прыйдуць і так яго усе возьмуць і сьціснуць, аж да горла душа прыйдзе. Потым душы я бяру ў іх, Пан Бог што раскажа, то учыню. Правай рукой бяру душы мусульманськія, левай рукой бяру душы кяфірськія. Такія уйдуць мусульмане да раю, кяфіраў укідаю ў пекла джэгэннэм. Хто злосьць чыніць, добрасьці ня будзе мець". Я мовіў: „Чы ты возьмеш і гэтую душу, у зямлю ўложыш гэтае цела?" Мовіў: „Так ест, я бяру душы, нічым учыню, якія вялікія панове, султанове. Як веле пакояў чыню без гаспадара, душу вазьму вялікім страхам так, як веле замкаў чыню пустымі. І ты ня будзь такім, каб 21) меў даць нутр гэтаму сьвету. Як веле тых, каторыя мовілі „Мой сьвет", усім тым я адняў уладу. Тыя рэчы ўспамянуўшы, заўсёгды 46) плачу: з неба ступіўшы, із зямлёй зьмяшаюся. Для таго ўсягды плачу; гэты напітак 67) відзячы, не засьмяюся; ведаю, што 7) і я такжа умру і сам сваю душу буду

---

[1]) прывітаў.

[2]) маемасьць.

[3]) няевернік.

брацьͅ вечны Пан Бог астанецца на век, а Стварыцель усё мае памарыць. Ствароныя памруць усе ангелы; ані зямля не застане, ані неба, ані людзі, ані ангелы".

Пашоў адтуль, аднаго ангела відзеў дзіўнага: як гляне на гэты сьвет—пустым учыніць; як гляне на мора—суха стане; лічбы мямаш, бяз лічбы ачэй мае. Глянуў на мяне, я вельмі спалохаўся: бяз лічбы ў яго ачэй ест. Адно крэсла паставілі пад яго із агню, і сядзіць той ангел на ём; як семдзесят сьвятоў, так вялікае; той ангел на ём сабе адпачываць учыніў. Сам так страшна сядзіць, бяз лічбы мукараў перад ім стаяць. Скора абачыў страшным яго, вельмі 65) дрыжаў, спалохаўся яго; дрыжалі косьці мае, як ліст на дзераве; на твары адмена стала; як пясок, так розум з галавы вышаў. „Ня дбай" мовіў.. Джабраіл. Я мовіў: „Джабраілу, хто то ест?" Джабраіл мовіў: „Пякельны ваявода то ест". Я мовіў: „Няхай страшна не глядзіць, страхам нутр мой няхай ня паліць". Джабраіл мовіў: «І браце, саромяйся, страшна не глядзі на прарока ты, то астатні, усіх нас надзея, Пан Бог нам прычынцай яго даў; паважай яго, то будзеш мець прычыну; не, так застанешся ў пекле на векі». Потым той ангел да мяне мовіў: „Ня ведаў я" а прабачэньня прасіў і вельмі 65) ўжо чыніў мне розныя чэсьці.

А перад намі былі адны варота. Я мовіў: „Што то за варота?" Мовіў: „Тут маюць увайці людзі пякельныя, пякельныя то варота, і Мухамэду, тут мае ўвайці той 26) грэшны уммет[1]). Ужо там у сярэдзіне сем пекел, кяфіра[2]) там усе ўвойдуць". «Адчыні, абачу пякельную парсону, як ест, буду знаць страх мукі». Устаўшы ангел адчыніў пякельныя варота; там-жа я відзеў усё, што ест. Скора ў сярэдзіну глянуў, як семкрот`земль бачыў, семдзесят тысячай мор відзеў вадзяных, прахам пойдзе, хто-б раз напіўся. Ад аднаго напіцьця з тае вады, чалавек агнём гарыць 68) зараз унутр а зьверх. На кажным беразе морскім семдзесят тысячай мест відзеў на беразе. Тыя места усе із жалеза былі, у кажнам месьце тысяча палацаў; для няверных стварыў той 26) моцны Пан, той 26) усім рэчам моцны і вялікі. Тыя палацы усе мядзяныя, у сярэдзіне поўна смалы кіпіць. У кажнам палацу тысяча пакояў ест, у сярэдзіне волава растоплена...

Потым яшчэ варота адчыніліся, сем пекел там мне яўна стала. Там відзеў адзін полк жанок, за персьці іх завешаны; з персьцяй іх выходзіць, замест малака, сукравіца-кроў. Я мовіў: «Што гэтыя на сьвеце чынілі?» Ангел рэк: «Малако свае прадавалі, у іх усіх свае дзеці былі, свае пакінуўшы, чужыя мамчылі».

Яшчэ відзеў адзін полк людзей. Тыя крычаць вялікім крыкам. Ланцугамі акаваны рукі іх, з патыліцы рвуць языкі іх, мукары языкі рэжуць, галавамі ўніз іх завешаны. Я мовіў: „То яшчэ хто ест, што 7) так веле мукі церпяць?" Мовіў ангел: „То манюкі, махляры" 69).

Яшчэ відзеў адзін полк блудных жанок. Яны крычаць, уздыхаюць; адзеньне іх смаляное, а ўсё цела нага, грэшна; па пояс у вагню стаяць. Я мовіў: „Гэтыя, што чынілі на сьвеце?" Сказаў: „Гэтыя мужоў ня слухалі, улегца мелі, чужалоства 70) чынілі, мужоў ня слухалі. Для таго іх адзеньне смаляное, блуд чынюшчых людзей такі быт будзе".

[1]) царква, як зборышча вернікаў.

[2]) няверніkі.

Яшчэ відзеў адзін полк людзей: галавы вялікія, зубы сьвіныя, брухі як горы або большыя, вужоў, гадаў у сярэдзіне поўна, у кажнага на шыі адзін страшны гад. (То слова маё праўдзіва, ня ест няпраўда!). Кажная гадзіна як хамуціна, на бруху сядзяць так пэўне. Агнём кормяць мукары іх і тое іх распаляе на шматы, на шматы. Праз вушы такжа вужы, гады ўходзяць і выходзяць, так яўна, як таемна. Я мовіў: „Гэтыя на сьвеце што за дзівы чынілі, што 7) так веле церпяць мукі"? Мовіў: „Гэтыя багатыры, каторыя давалі скарб на інтэрас; яны быццам 71) людзем выгоду чынілі, а ў тым чы халал [1]), чы харам [2]) не глядзелі ядалі, за то ім заплата то ест. Хто што заслужыць, то яму заплата будзе".

Яшчэ відзеў адзін полк маладых і старых, відзеў у вагню гараць з канца ў канец, а перад імі па дзьве йстравы 72) розныя: адна халал, а другая харам. Халал пакінуўшы, харам ядалі, у вагню за тое мучацца. Я мовіў: „То хто ест?" Мовіў: „Хто халал пакінуўшы, харам ядалі"; мовіў: „у тых усіх халал быў, яны пакінуўшы харам ядалі".

Яшчэ відзеў адзін полк жанок. І тыя мукі вялікай церпяць: рукі іх рэжуць, пілою пілуюць на штукі, на штукі, і тыя штукі знову зрастаюцца. Так у вагню душы іх мучацца! Самых іх тым мясам кормяць, а над то што мае быць мука горшая 73)? Я мовіў: „Гэтыя на сьвеце што чынілі?" Мовіў: „Людзей зачы 74) гаварылі, абмаўлялі; гаварылі яны людзкі гейбэт [3]) рвучы, рвучы елі людзкое мяса".

Як маю казаць, у пекле над людзьмі як вялікі страх? Сем пекал зусім 75) відзеў, так вам знаці даў. Потым адвярнуўся назад ад пекла, із страху стала парсона мая жоўта.

Яшчэ відзеў адзін пакой з смарагду — Стварыцель то стварыў з моцы — а паправе, а палеве вокна ест: правіца сьмяецца, лявіца плача. Там-жа, відзеў, сядзіць адзін чалавек — пей салават, каб 21) з нутра немарасьць вышла! 76)—на правую старану, на рай гляне—сьмяецца, іграе, радуецца, хараша гуляе; з левага боку на пекла гляне, із ачэй яго, замест сьлёз, кроў ідзе; а на зямлі, як веле ест, душы выводзяць, адамськія душы. Із сьмеху-плачу яго выклад: адны кяфіра [4]) ест, а другія Божыя мілосьнікі. Мусульман паправадзяць з павагаю, а на патканьне выйдуць райськія панны з райськімі коньмі; усадзяць на каня райськага, імя Бурак [5]) азьмі, то той конь указаваць яму будуць. Чалавек то абачыўшы, зарадуецца і плакаць перастане, гуляе, сьмяецца. Кяфірськія душы... нясуць да пекла мукары пякельныя. Таму чалавеку плач з тае прычыны......

[1]) дазволенае.

[2]) забароненае.

[3]) славу.

[4]) няверніkі.

[5]) часіна, гэтта назоў каня.

Зацемкі.

У ніжэй пададзеных зацемках паказана, як ё ў варыгінале.

1) Напрод, 2) ядыный, 3) харонгві (г=g), 4) бляск, 5) тылька, 6 бляск, 7) жэ, 8) паміж „крыльля" і „семдзесятсот" у варыгінале ё „спэлна", 9) с вары, 10) васолы, 11) Прыаздобіць, 12) Ото, 13) бляскем, 14) фрасаваўся, 15) Мовілам, 16) у варыгінале татарскае „бардак", 17) скрыдла, 18) ад, 19) тэж, 20) нявясту, 21) жэбы, 22) а бурак, тат., 23) у варыгінале паміж „сафі" й „праціў" ё незразумелае „пачысіўшы", 24) ядыноства вонтпіць, 25) Ото-ж, 26) тэн, 27) ядынага, 28) у вар. абмыльна „салавай", 29) Вэдле, 30) паздравеньне табе мовячы, 31) жаляза, 32) чвартае, 33) міласерны, 34) Чвартага, 35) твары харошай, 36) уласьне як, 37) мове, 38) мові, 39) чалавечай твары, 40) ў вар. Пан Бог, 41) пралажоным, 42) тэн ядыны, 43) у вар. паміж „пакланіўся" й „Скора" ё „спэлна", 44) Прэндка, 45) паміж „ест" і „зямля" ў вар. ё „арш, курс", што значыць „неба, зямля", 45а) патравы, 46) заўша, 47) снадна, 48) ня вотпі, 49) ядыностве, 50) сланэчнае сьветласьць 51) запахах, 52) мартвага, 53) вышэй, 54) міласердны, 55) паміж „ест" і „у кожнам" у вар. ё „адзін ад другога", 56) шчоб, 57) авоцы непадобныя тым авоцам, 58) авоцам, 59) чвартаму, 60) чвартам, 61) спэлна, 62) твары, 63) прэндка, 64) мая душа, 65) Барза, 66) белаглова, 67) трунак, 68) гарэць, 69) лгары, шальберы, 70) цудзалоства, 71) рэкема то яны, 72) патравы, 73) твардшая, 74) завочне, 75) спэлна, 76) фрасунак вышаў!

Два, тры і балей пунктаў паказуюць, што пры выданьні прапушчана крыху тэксту.

Вельмі цікаваю ё такжа лягенда „А сьмерці Мухамэда". Расказана яна наіўна й хораша. Ужо пачатак паказуе на штосьь надзвычайнае: „Гэй, мусульмане, паслухайце, як із сяго сьвета ісходзіў Мухамэд-прарок". Магамэд быў сьмяротна хворы, дзеля таго зрабіў адказ сваім памачнікам і назначыў наступнікам сваім Абу Баккіра. Зараз прыйшоў ангел сьмерці Азраіл і папытаўся ад Пана Бога, ці ня хоча Магамэд умерці. Далей настала быццам умова Магамэда з Богам аб тым, за які час перад сьмерцяй Бог прыйме каяту ад мусульманаў. У бібліі расказуецца аб падобнай умове Абрагама з Богам у справе зьніштожаньня Содомы й Гоморы. Просьле гэтага Азраіл узяў душу Магамэдаву. Канчаецца лягенда поўным глыбокае пашаны й урачыстасьці паховам Магамэда. Друкуем гэтую лягенду ўсю [1].

А сьмерці Мухамэда.

Гэй, мусульмане, паслухайце, як із сяго сьвета ісходзіў Мухамэд прарок. Мовіў: „Калі сегасьветныя слова слухаеце, ад ліхіх дзел трэба каяту чыніць, бо з сегасьветных слоў нет помачы, толька многа лямэнту й клопату вясёлага сёй сьвет засмуціць 1). Айша [2]), матка наша,

---

1) Способ друкаваньня тут гэтае лягенды, як і цытатаў, прыводжаных ніжэй з іншых лягендаў, той самы, што й пры надрукаваным вышэй „Мэраджу".

2) другая жонка Магамэдава.

а прароцкая жана, аднаго дня сядзела дома водле 2) прарока із сахабэямі [1])... Мухамэд прарок яго міласьць на Божай дарозе ляжаў, хворы быў, вялікую боль меў, з болі дрыжаў, з парсуны зьмяніўся, з ачэй сьлёзы йшлі, цяжка ўздыхаў, плакаў: „Міласьцівы Божа, зьмілуйся над мусульманмі!"

Сахабэёве ўсе ўсталі й мовілі: „Гэй, наша слонца, сьветласьць твая над душамі душа праўдзівая, чаго плачаш, кажы нам, таемную рэч абяві?" Прарок мовіў: „Ужо я із сяго сьвета зыйду, толькі 3) вам адзін васыят [2]) адкажу: посьле мяне, мае таварыства, не разлучайцеся, ў вадным 4) мейсцу пяць вахтаў [3]) намаз [4]) кланяйцеся. Абу Баккір [5]) на маём мейсцу нягай будзе імамам [6]), што вам раскажа, слухайце яго, Абу Баккіра, не адступайце, моцна веру сваю дзяржыце. Калі ня будзеце слухаць, із шайтаном у пекле гарэць будзеце". Таварыства мовілі: „Гэй, прароча, без цябе нам ня трэба сёй сьвет, мы у сём сьвеце не кахаемся, з табой на той сьвет пойдзем". Прарок мовіў: „Так Божы вырак: хто прыйдзе на сёй сьвет і пойдзе на той сьвет; кажнаму, каму ўперад прыйдзе, душу ўперад возьмуць, бяз суду сьмерці нікому нямаш, кожнаму водле 5) рызку [7]) век будзе". Азраіл [8]) борзда прышоў па прароцкую душу. Прышоўшы ў варота стукаў, за варотмі стаяў. Айша вышла, мовіла: „Хто ты ест?" Айша клікала прарока, мовіла: „Прышоў адзін Арабін, варота ў руках дзяржыць, страх: зямля, неба дрыжыць". Прарок мовіў: „Не Арабін, то той Арабін, што цела з душой разлучыць, цела пяском засыпіць, двух таварышаў аднаго ад другога разлучыць. Айша, пайдзі варота адчыні". Азраіл у двор увашоў, прароку селям [9]) даў: „Salamun alaikum ja mustafa! [10]) Гэй, прароча, гэтагасьветны сонца над мусульманмі! я прышоў па 6) душу тваю з языкам із дазваленьнем". Прарок мовіў: „Чаму ў варотах многа стаяў, браце?" Азраіл мовіў: „Мне Пан Бог казаў табе па колька крот селям даваць, мовіў Пан Бог: „Пытай у прарока, чаго плача, чы ня хоча ўмерці". Мухамэд мовіў: „Гэй, браце Азраілу, я даўно хачу да Пана Бога, толька плачу для мусульман; гэй, міласьцівы Божа, зьмілуйся над мусульманмі! для таго плачу. Гэй, Азраілу, Пан Бог для мяне што згатаваў?" Азраіл мовіў: „Пан Бог для 7) цябе ўсе нябескія варота казаў адчыніць, прароцкія 8) душы радуюцца, цябе чакаюць; Пан Бог рызвану [11]) казаў рай адчыніць „няхай Мой прыяцель прыйдзе"; на ўсіх нябёсах ангелы тасьбіхі [12]) пяюць, радуюцца". Азраілу, яшчэ ў Пана Бога прашу для му-

1) памачнікі Магамэдавы.

2) адказ, васыят адкажу—адказ зраблю.

3) ар б. „вакт"—пара, раз; ё пяць пораў або разоў у дзень, у каторыя мусульмане павінны маліцца.

4) папэрску малітва.

5) араб. Абу Бакр, прыяцель Магамэдаў і першы каліф (11/632—13/634).

6) імам—сьвяшчэньнік мусульманскі.

7) араб. рызк—маемасьць, штадзенны хлеб.

8) ангел сьмерці.

9) даць селям—прывітаць

10) пераклад: Супакой табе, выбранча!

11) рызван—нябесны брамнік.

12) араб. тасьбіх—малітва шмат разоў паўтараная.

сульман: маім умметам [1]) каяту калі прыйме?“ Азраіл, як вокам 9) мігнуць, да Пана Бога схадзіў, пасолства 10) ўчыніў. Пан Бог рэк: „Я уммету яго пакаяньне для яго просьбы за год прыйму“. Таго-ж часу Джабраіл [2]) прышоў. Прарок мовіў: „Гэй, браце Джабраілу, прасі ў Бога, майму уммету каяты на год многа“. Джабраіл, як вокам 9) мігнуць, вярнуўся і мовіў ад Пана Бога: „Мухамэд, Пан Бог рэк: „Я уммету твайму каяту за паўгода прыйму“. Пракок мовіў: „Многа паўгода“. Джабраіл, як вокам 9) мігнуць, вярнуўся ад Пана Бога: „За месяц каяты перад сьмерцяй“. Мухамэд мовіў: „Многа месяца“. Пан Бог: „За адзін тыдзень перад сьмерцяй прыйму“. Мухамэд мовіў: „Многа, майму уммету сьмерць наглая бывае“. Пан Бог рэк: „Я, Мухамэд, уммету твайму перад сьмерцяй за адзін дзень прыйму“. Мухамэд мовіў: „Многа, мае умметы на вайне за веру мусульманськую б'юцца з кяфірамі [3]), не пасьпеюць каяты чыніць“. Пан Бог рэк: „За паўдня перад сьмерцяй каяту прыйму“. Мухамэд мовіў: „Многа і паўдня, маім умметам наглая сьмерць бывае“. Пан Бог рэк: „Я, Мухамэд, прыяцелю Мой, твой уммет, калі за гадзіну перад сьмерцяй пакаецца, калі скажа la ilaha illa 'llahu Muchammad rasulu 'llahu [4]), тагды каяту прыйму“. Прарок мовіў: „Хвала Табе, Божа, што майму уммету зьмілаваньне Божае ест, амін“. Таго-ж часу Азраіл прыступіў і душу ўзяў у прарока. Тагды сьветласьць пашла да аршу [5]), стлупам на арш [5]) узышла....

Потым Алей [6]) сьвяты із сахабэямі мылі; Аббасаў узьліваў, Алей мыў. Ад Пана Бога голас прышоў: „Сарочкі ня здыймуйце, у сарочца мыйце. Асман у саване 11) нарадзіў. Потым Джабраіл і ангелей бяз лічбы над пракокам 12) джэназа намаз [7]) пелі. Потым Азраіл прышоў і з нім бяз лічбы ангелей джэназа намаз пелі. Потым Мекаіл [8]) прышоў, бяз лічбы ангелей джэназа намаз пелі. Потым Абу Баккір із усімі сахабэямі прышоў, джэназа намаз пелі. Потым жанчыны 13) прышлі, сталі над пракокам, джэназа намаз пелі. Потым малыя дзеці прышлі, сталі над пракокам 12) джэназа намаз пелі і ўсе сахабэёве 14) плакалі й пахавалі.

Зацемкі.

1) Просьле гэтага слова ў варыгінале ё яшчэ „што ачыма відзячы“, 2) вэдле, 3) тылька, 4) едным, 5) вэдлуг, 6) у варыгінале„ па“ нямашака, 7 паміж „Бог“ і „для“ ў вар. ё яшчэ „мовіў“, 8) прароскія, 9) окем, 10) пасэлства і, 11) у вар. абмыльна — „у саван“, 12) прарокем, 13) нявясты, 14) у вар. абмыльна—„сахабэёў“.

---

[1]) араб. уммет—а) грамадзкасьць веруючых, царква, b) вернік.

[2]) ангел Гаўрыіл.

[3]) араб., з няверніками.

[4]) пераклад: Няма Бога апрача Бога, Магамэд пасол Божы. З прычынаў тэхнічных не абаз-ачана ў прыведзеным казаньні даўжыня самагукаў ды замест літ. *га* ўжыта *ch*.

[5]) араб. арш—неба, пасад Божы.

[6]) Алі Ібн Абу Таліб, гарачы прыхільнік Магамэдаў, муж ягонае дачкі Фатымы і чацьверты каліф (35/656—40/661).

[7]) пахоўную малітву.

[8]) ангел Міхаіл.

Скажу колькі словаў аб асталых трох лягендах Аль-Кітабу Беларускага Музэю Івана Луцкевіча ў Вільні.

Гісторыя а Мар'яме. „Прарок Іса“ (Хрыстос) з маткаю сваёй Марыяй „пашлі на Лібнан гару і там Пану Богу паклон чынілі, дзень у дзень посьнікалі, а ўвечар адпосьнікаліся траўным карэньнем. Аднаго дня Іса прарок Яго Міласьць для адпосьнікаваньня па карэньне траўное пашоў“. Астаўшыся адна, „Мар'яма“ „намаз (малітву) кланялася“. У гэтым часе прыйшоў душаемца Азраіл і душу ў яе ўзяў. У часе сьмерці маці Хрыстовае „нябескія ангелы плакалі голасам вялікім, таго дня на зямлі ўсе рэчы рушыліся, зьвярата польныя ўсе.. плакалі, птаства на паветру ўсе, грумадамі стоячы, плакалі“. Плакалі також „для Іса прарока“ зямля і месяц і сонца, горы, мора.

Па Божаму загаду „райськія панны“ абмылі цела, ангелы Гаўрыіл і Міхаіл „дол выкапалі“, усе іншыя ангелы пахоўную малітву („джыназа намаз“) пелі і схавалі. Хрыстос зьвярнуўся да Бога з гэткай просьбаю: „Маткі Я Сваей часу яе сьмерці і па сьмерці ня відзеў.., цяпер прашу Цябе, Божа Мой, кажы Мне матку Маю ўказаць, каб за Мной мовіла“. Бог выслухаў гэтую просьбу, і Хрыстос гаманіў із Сваёй маткаю ля яе магілы.

„Потым Іса прарок.. па сьвеце хадзіў, а потым Пан Бог Яго на неба ўзяў і да суднага дня будзе на небе. А перад судным днём дадждждал (антыхрыст).. паўстане на мусульман, увесь сьвет ізвае, то на той час Пан Бог Яго із неба зашле мусульманам на помач праціў дадждждала. Іса прарок Яго Міласьць, з неба зышоўшы, дадждждала праклятога заб'ець і веру мусульманськую запрэць, і расшырыцца вера мусульманськая, і знову сорак год мае жыць на сьвеце“. Потым Іса „із гэтага сьвета зыйдзе“.

Як бачым із вышперададзенага зьместу, месца ў гэтым апавяданьні, дзе кажацца аб зьявах у прыродзе па сьмерці сьв. Марыі, вельмі падобнае да апавяданьня евангелістых аб зьявах па сьмерці Хрыстовай.

Лягенда аб стварэньні розуму. У гэтай кароценькай лягендзе сказана, з чаго Бог розум стварыў („з вялікага хараства, з дарагіх рэчай райськіх“); зацемлена, што „Розум ня ест у чалавека душа, ані шлунак, ані сустаў ніякі ест. Межы душы і межы суставаў у чалавека розум; у Пана Бога ест усьцівая й харошая рэч розум“. Далей шырэй кажацца аб адносінах розуму і разумнага чалавека да Бога—ведама, з гледзішча мусульманскае веры.

Спрэчка Мэккі з Мэдынаю і неба із зямлёю, хто з іх у Бога лепшая й шчасьліўшая. Мэкка шчасьлівая, бо ў ёй „Мухамэд прарок радзіўся“, а Мэдына, бо тут прарок пахаваны. На небе „майстат Божы“, але на зямлі „Мухамэд прарок, мілосьнік Божы, ляжыць і судны дзень — суд Божы“ — на зямлі „і Сам Пан Бог з неба на зямлю зыйдзе і ўсіх судзіць будзе, рай і пекла на зямлі стаяць“.

Зацемленыя абмылкі друку:

На 8-й бал., 6 радок зьнізу замест „бал. 122“ мае быць „бал. 14“, а на 13 бал., 3 радок зьн. зам. „бал. 123“ мае быць „бал. 15“.

БЕЛАРУСКАЕ КООПЭРАЦЫЙНА – ВЫДАВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВА "АДРАДЖЭНЬНЕ" МЕНСК 1991 г

выданьне 3-е заказ 8 наклад 1000